Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Камітэту Саветаў БССР.

ЦЕНА НУМАРУ 5 кап.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Невыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:

На 1 месяц	— 80 к.
„ 3 „	2 р. 70 к.
„ 6 „	4 р. — к.
„ 1 год	8 р. — к.

Зьмена адрэсу: іногародняя — 20 к., мясцовая — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ:

За радок шапарэлі пасьля тэксту — р. 50 к.
За радок шапарэлі пасьлярод тэксту 1 р. — к.
За радок шапарэлі перад тэкстам 1 р. 50 к.
Скідкі на 50 проц. дазволены.
Зьмена тарыфу бароцца 10 проц. калогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ:

За 1 дакумент . . . 35 кап.
За кожны дадатковы . . . 15 „
Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за дакумент . . . 15 „
За кожны дадатковы . . . 5 „
Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, на ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ва ўсіх пошт.-тэл. канторах.
АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

10 год — ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. — № 233 (2722) Пятніца, 11-га кастрычніка 1929 г.

54 кр. "Савецкая Беларусь" Одесса, Пастера 13, государ-стен. публичн. библиотека. ступ. сьнок. адзін экз.

Пастановы прэзыдыуму ЦКК УсеКП(б) і калегіі НК РСІ СССР аб рабоце ЦКК-РСІ Беларусі

НА ДАКЛАДУ т. КАЛНІНА І САДАКЛАДУ тав. БЕЛЕНЬКАГА.

Заслухаўшы даклад т. Калніна і даклад члена ЦКК УсеКП(б) т. Беленькага, прэзыдыум ЦКК УсеКП(б) адзначыць работу ЦКК-РСІ Беларусі ў цэлым здавальняючай.

ЦКК-РСІ Беларусі былі праведзены на грунтоўных абсьледваньняў (як па плану плане, так і па заданьням ЦК УсеКП і СССР), накіраваных да ўпарадкаваньня асобных відаў савецкай і гаспадарчай работы. У прыватнасьці была праведзена работа ў галіне рэарганізацыі савецкага апарату на функцыянальнай сыстэме і па пашырэньні сфэры новага савапарату. Была моцнена за справаздачны перыяд самая работа органаў КК-РСІ (больш шырокае прыцягненьне працоўных да работы РСІ, узмацненьне справаздачы перад масамі, больш значнае асьвятленьне ў друку работы ЦКК-РСІ).

Разам з гэтым прэзыдыум ЦКК УсеКП(б) павінен адзначыць рад значных недахопаў у рабоце органаў КК-РСІ Беларусі:

Пры наяўнасьці сыгналізуючых фактараў хваравітых зьявішч у некаторых арганізацыях, ЦКК Беларусі ня прымала своечасова адпаведных мер іх выкрыцьця і дапусьціла запяжку правядзеньні мерапрыёмстваў па ўзмацненьні арганізацый (Мазыр).

Не праявіла дастатковай рашучасьці у зьнятьці з адказных пастоў ратнікаў, не апраўдаўшых сябе на кіючай рабоце, так і ў асобных выдках па барацьбе з скрыўленьнем лясавай лініі.

Некаторыя Акр. КК-РСІ праявілі абасьць па барацьбе з разлажэньнем важымам самакрытыкі ў партарганізацыях, фармальна адносіліся да разгляду рабселькораўскіх заметак.

Лічыць адной з важнейшых задач КК Беларусі, пры правядзеньні чысткі партыі і савапарату, рашучае ышчэньне судова-сьледчых органаў клясава-чужых, разлажыўшыхся элементаў і парушыцеляў рэвалюцыйнай законнасьці.

Сыстэматычна правяраць правядзеньне дырэктыў партыі ва ўсіх галінах работы савецкага і гаспадарчага апарату, у прыватнасьці зьвярнуць увагу на праверку рэвалюцыйнай законнасьці шляхам пастаноўкі на пленумах (прэзыдыумах) КК дакладаў аб рабоце суда і пракуратуры і дабіцца своечасовага разгляду спраў, якія перадаюцца КК-РСІ ў судова-сьледчыя органы.

Адзначыць засьмечанасьць і сыстэматычнае скрыўленьне клясавай лініі ў рабоце зямельных і фінансавых органаў Беларусі, якія выказаліся ў наступленьні хутарскіх гаспадарак, патуранні кулацкім элементам пры разьмеркаваньні зямельных, лясных і інш. угодзьдзяў, недаабкладаньні кулацкіх, пераабкладаньні серадняцкіх гаспадарак і г. д.

Прыняць пад увагу рашэньні прэзыдыуму ЦКК Беларусі з 17 студзеня 1929 г., якія накіраваны на аздараўленьне работы зямельных органаў і ліквідацыю заўважаных агідпасьцяў.

У далейшым ЦКК Беларусі неабходна ўзмацніць кантроль над правільным правядзеньнем зямельнай і падатковай палітыкі партыі, правесьці рашучае аздараўленьне зямельных і фінансавых органаў шляхам выдаленьня клясава чужых элементаў і вылучэньня на працу ў іх рабочага бядняцкага актыву.

ЦКК-РСІ Беларусі ў галіне рацыяналізацыі прамысловасьці не дасягнула істотных вынікаў і ня прыняла адпаведных мер па перамаганьні супраціўленьня ВСНГ БССР правядзеньню ў жыцьцё пастаноў пленуму ЦКК УсеКП(б).

ЦКК-РСІ Беларусі павінны ў бліжэйшы час дабіцца рашучага пералому ў справе ўзмацненьня рацыяналізацыі прамысловасьці і мабілізаваць калектыў гэтай задачы рабочую грамадзкасьць.

ЦКК-РСІ Беларусі ня было ўдзелена дастатковай увагі важнейшаму ва ўзмовах Беларусі пытаньню разьвіцьця саматужнай прамысловасьці. Рашэньні ЦКК Беларусі па абсьледваньні гэтай галіны ў 1928 годзе аказаліся ў значнай ступені нявыкананымі.

ЦКК-РСІ Беларусі павінна прыняць рашучыя меры па правядзеньні ў жыцьцё рашэньняў, якія накіраваны на ўсямернага разьвіцьця саматужнай мясцовай прамысловасьці, узмацненьня каапэраваньня саматужнікаў, галоўным чынам у сельскіх раёнах, мястэчках і закончыць у бягучым годзе выстку арцеляй ад кулаца-нэпманскіх элементаў.

ЦКК-РСІ Беларусі правяла рад мерапрыёмстваў па рацыяналізацыі капітальнага будаўніцтва. Але апошняе яшчэ мае значныя недахопы, у прыватнасьці, нярэдка мае месца неугрунтаванае па сваёй мэтазгоднасьці і эфэктыўнасьці будаўніцтва.

Прапанаваць ЦКК-РСІ Беларусі рашучыя дабіцца аздараўленьня капітальнага будаўніцтва, у прыватнасьці ўдзяліць большую ўвагу пытаньням мэтазгоднага накіраваньня і эфэктыўнага выкарыстаньня сродкаў, што адпускаюцца на капітальнае будаўніцтва як прамысловае, так і камунальнае.

Канстатаваць, што дырэктыва аб 20-процантным зьніжэньні адміністрацыйна-кіраўнічых выдаткаў ня выканана поўнасьцю (у прыватнасьці гаспадарчымі органамі толькі на 7,9 проц.).

Прапанаваць ЦКК-РСІ Беларусі ў працягу 1928-29 году выканаць дырэктывы ў гэтай галіне, праводзячы сваю працу пры шырокім удзеле рабочай грамадзкасьці, прыцягваючы вінаўных у парушэньні дырэктыў да суровай адказнасьці.

Прапанаваць ЦКК Беларусі ў далейшым своечасова і больш рашуча рэагаваць і на ўзьнікаючыя хваравітыя зьявішчы ў партарганізацыях і савецкім апараце, забясьпечыўшы поўнае правядзеньне самакрытыкі, агараджаючы крытыкуючых ад усякага роду перасьледваньняў, прыцягваючы ўсіх, хто парушае дырэктывы партыі, да суровейшай адказнасьці.

Жорстка праводзіць рашэньні 16 партканфэрэнцыі аб сьпыненьні перабросак адказных работнікаў, якія аказаліся няпрыгоднымі для кіраўнічай працы, з установы ў установу, з раёну ў раён, у прыватнасьці сумесна з ЦК КП(б)Б абмеркаваць пытаньне аб мэтазгоднасьці далейшага прабываньня на адказных пастох былых кіраўнікоў акруговых арганізацый, адкліканых з іх у выніку выкрыцьця хваравітых зьявішч.

Прапанаваць ЦКК Беларусі дабіцца ўзмацненьня органаў КК-РСІ партыйна-вытрыманымі, кваліфікаванымі працаўнікамі для ўзмацненьня з боку АКК барацьба з хваравітымі зьявішчамі і своечасовай інфармацыяй аб іх ЦКК Беларусі і забясьпечыць хуткае расьсьледваньне рабселькораўскіх заметак.

Пры стракатым нацыянальным складзе Беларусі ў радзе фактаў скажэньні нацыянальнай палітыкі партыі. ЦКК Беларусі не ўдзяліла дастатковай увагі нацыянальнаму пытаньню (два гады падрад у плян работ ЦКК было ўключана пытаньне аб правядзеньні нацпалітыкі і ня было выканана).

Прапанаваць ЦКК Беларусі ўключыць у плян работ 1929-30 г. праверку выкананьня дырэктыў партыі ў галіне нацпалітыкі, узмацніць барацьбу з праяўленьнямі шавінізму і антысэмітызму.

ЦКК Беларусі, змагаючыся з асобнымі фактамі разлажэньня судова-сьледчага апарату і парушэньня рэвалюцыйнай законнасьці ў радзе округаў (Мазыр, Ворша, Полацак, Віцебск), не паставіла ва ўсёй шырыні пытаньня аб аздараўленьні судова-сьледчай працы ў цэлым.

Зьвярнуць увагу на слабую пастаноўку ЦКК-РСІ кантролю і праверкі сваіх рашэньняў, на недастатковую ўвагу з боку абсьледваных органаў да правядзеньня ў жыцьцё рашэньняў ЦКК-РСІ.

Прапанаваць ЦКК-РСІ Беларусі наладзіць кантроль і фактычную праверку выкананьня сваіх рашэньняў шляхам непасрэдных паўторных абсьледваньняў, а таксама шляхам прыцягненьня да гэтае работы парт'ячэек, вытворчых эканомнарад, часовых кантрольных камісій, сэкцый РСІ, рабселькораў, лёгкай кавалерыі і друку. Віноўных у невыкананьні рашэньняў РСІ прыцягваць да суровай адказнасьці ў партыйным і савецкім парадку.

Адзначыць, што ў працы бюро скаргаў слабы арганізацыйны ахоп працы з масамі адсутнасьць абагуленьня недахопаў у працы Дзяржапарату. Для зьнішчэньня асноўных прычын скаргаў—недастаткова хуткі разбор скаргаў і слабая пастаноўка кантролю як за праходжаньнем скаргаў, так і за выкананьнем рашэньняў бюро скаргаў.

Прыняць пад увагу, што на красавіковым пленуме ЦКК Беларусі былі прыняты рашэньні аб узмацненьні і ўпарадкаваньні работы бюро скаргаў.

Кітайская ваеншчына напярэдадні фінансавага краху.

АРГАНІЗАТАРЫ ПРАЦЭСУ 38 ПАЦЯРПЕЛІ ПАРАЖЭНЬНЕ.

Мукдэну патрэбны грошы.

ТОКІЁ, 8-X. Як паведамляе агэнцтва Міура, Нанкін і асабліва Мукдэн церпяць вялікія фінансавыя цяжкасьці ў сувязі з неабходнасьцю ўтрымліваць войска на савецкай мяжы, а таксама ў сувязі з падрыхтоўкаю войска да зімовай кампаніі. У вайсковых колах лічаць, што мукдэнская ўлада можа выкарыстаць у бліжэйшым часе якую-небудзь магчымасьць, каб разьвязаць канфлікт незалежна ад Нанкіну, калі апошні ня будзе даваць Мукдэну фінансавай дапамогі.

* * *

ТОКІЁ, 10-X. Згодна паведамленьня з Харбіну, у сувязі з фінансавым крызісам кітайскія, чужаземныя і расейскія камэрсанты ліквідуюць свае прадпрыемствы ў Манчжурыі і выяжджаюць у іншыя правінцыі.

АБВІНАВАЧВАНЬНІ НЕ ДАКАЗВАЮЦЦА.

ТОКІЁ, 10-X. Паведамленьне з Харбіну ад 9 кастрычніка кажа: «Сёньня на працэсе 38 выступалі апошнія абаронцы Відэр і Маленка. Абаронца Маленка ў сваёй прадмове слазаў: „Ёсьць два шляхі—або ўсіх савецкіх грамадзян лічыць камуністамі і ўсіх судзіць, або даказаць абвінавачаньне. На справе, падсудныя ні ў чым не абвінавачаны канкрэтна і абарона даводзіцца мець справу ня з фактамі, а з тлумачэньнем пракурора. Ніпчасьце падсудных у тым, што палітычная атмасфера напружана, але яна мяняецца. Пры ўхвале прысуду прыгавору суд павінен браць пад увагу толькі факты, а не западозраньні».

Усе абвінавачаныя, апроч 4, адмовіліся ад апошняга слова. Усе, хто выкарыстаў гэтае права, адхілі сваю віну і заявілі, што яны чакаюць апраўданьня.

Факты аказаліся дутымі.

ТОКІЁ, 10-X. Водпуг паведамленьня з Харбіну, пасьля прамоў абаронцаў Малых і Мінцкага пракурор, з прычыны важкасьці даводаў прызнае, што на далучанай да справы фатаграфіі з малюнкам, што нехта паліць дакументы, сфатаграфаваны не падсудны Пода, і што далучаны ў адбітку «явачны ліст» не адпавядае прозьвішчам падсудных. Пракурор таксама ўзяў назад абвінавачаньне аб тэлеграме з Масквы ў Харбін наконт Фынь-Юй-Сяна, тэрору і г. д. Такім чынам, абвінавачаньне расьпісалася ў сваім бясьсільлі і правале. Абарона са здаволеньнем адзначала, што пракурор зьняў асноўныя дакументы абвінавачаньня і заявіла, што такім чынам абвінавачаньне цалкам зьнімаецца. У горадзе адкрыта гаворань, што арганізатары працэсу пацярпелі суровае паражэньне. Прысуд чакаецца 15-га кастрычніка.

Нанкін дагаварваецца з Мукдэнам.

ТОКІЁ, 9-X. З Манчжурыі паведамляюць, што Чжан-Цзо-Сян, які зьяўляецца галоўнакамандуючым войскамі Чжан-Сюэ-Ляна, ухіляецца ад выезду на савецка-манчжурскую мяжу.

Прадстаўнік нанкінскага міністэрства замежных спраў Го-Туэ, які знаходзіцца ў Харбіне, выехаў у Мукдэн. Перад выездам Го-Туэ заявіў, што нанкінскі ўрад ухваліў у сувязі з савецка-кітайскім канфліктам шэраг пастаноў і паслаў у Мукдэн яго для пагодженьня гэтых пастаноў з манчжурскаю ўладаю.

Спробы „адхіліць" весткі аб расстрэле.

ТОКІЁ. З Харбіну паведамляюць, што газэта „Гунь-Бао" ў нумары ад 9-га кастрычніка зьмясьціла наступную заметку: „Чуткі аб расстрэле савецкіх грамадзян у Цыцыкары пасьля праверкі аказаліся неадпавядаючымі сапраўднасьці". Між тым, як вядома, паведамленьне аб расстрэле было агалошана на вестках самой газэты „Гунь-Бао", якая зьмяшчае толькі афіцыйную інфармацыю аб рэпрэсіях супроць савецкіх грамадзян.

„Гунь-Бао", выпадкова прагаварыўшыся 24-га верасьня і пераканфузіўшы кітайскую ўладу, зараз рапыла апраўдацца «адхіленьнем». У харбінскіх рабочых колах лічаць, што «адхіленьне» яшчэ больш падсьвярджае западозраньне аб тайных распраўах і абясцэньвае ўсе наогул афіцыйныя адхіленьні кітайскае ўлады.

Хлусьня Гаміндану.

ШАНХАЙ, 10-X. Шанхайская арганізацыя Гаміндану выпусьціла пракламацыю, у якой граміць партыю „рэарганізацыі", зазначаючы, што яна ў супрацоўніцтве з камуністамі задумвае скінуць урад і падарваць Гаміндан, за што „рэарганізацыяністы" атрымалі ад саветаў мінімум 50 міліёнаў даляраў. У другой пракламацыі высунута патрабаваньне арышту Волінгтона Ку.

Ваяўнічыя настроі.

ШАНХАЙ, 10-X. Нанкінскі ўрад аддаў загад аб генэральным наступе ўрадавага войска супроць гуансійцаў. Гуандунскае войска выступіла ў напрамку да Нанкіну. Згодна паведамленьня друку ў Нанкіне выбухнула паўстаньне. Падрабязныя паведамленьні аб паўстаньні не прапушчаюцца цэнзурай.

ПРАЛЕТАРЫЯТ НАСТУПАЕ НА БУРЖУАЗІЮ.

За сацыялістычнае будаўніцтва СССР.

ГЭЛЬСІНГФОРС, 9-X. З 5 да 8 кастрычніка ў Гэльсінгфорсе адбываўся зьезд раб. і сялян усёй Фінляндыі. Зьезд прайшоў пад знакам барацьбы супроць падрыхтоўкі імпэрыялістычнай вайны.

Ухвалена рэзалюцыя, у якой 8-га лістапада абвяшчаецца днём масавых дэманстрацый пад лозунгам падтрыманьня сацыялістычнага будаўніцтва ў СССР.

Зьезд ухваліў таксама рэзалюцыю пратэсту супроць спроб мілітарызацыі фінляндзкай арміі і рэзалюцыю з патрабаваньнем самавызначэньня для фінляндзкіх швэдаў.

Тыдзень агітацыі і маніфэстацыі.

ПАРЫЖ. Унітарныя прафсаюзы працаўнікоў прадпрыемстваў вайсковага і марскога ведамстваў наладжваюць з 7 да 12 кастрычніка тыдзень агітацыі і маніфэстацыі, каб дамагчыся павялічэньня заработку, якое ўсякімі спосабамі адцягваецца адміністрацыяй.

Адмовіліся аднавіць працу.

ЛЁНДАН, 9-X. Агэнцтва Рэйтэра паведамляе з Сіднею (Аўстралія): «Дэлегацыя аўстралійскіх гарнякоў адхіліла прапанову аднавіць працу ў капальнях (Новы Паўднёвы Уэльс) на ўмовах зьніжэньня заработку".

Абвінавачваньне кампартыі ў арганізацыі „дня паўстаньня".

ПАРЫЖ. Дазнаньне па справе аб „змове супроць безапаснасьці дзяржавы" набывае новую форму. У фармулёўцы абвінавачаньня 1-е жніўня называецца цяпер не «рэвалюцыйным днём», а «днём паўстаньня». Дапытаны сьледчым сэкратар кампартыі паказаў усю безпадстаўнасьць такога абвінавачаньня. Фрашон заявіў сьледчаму, што чырвоны дзень быў днём міжнароднай мабілізацыі сіл рабочае клясы, а ня днём паўстаньня, бо яшчэ няма ўмоў, неабходных для заваёвы ўлады пралетарыятам.

Сэкратар унітарнай фэдэрацыі паштавікоў Гурдэ адзначыў на допыце, што ўлада, якая забараніла ў дзень 1 жніўня антыімпэрыялістычныя рабочыя дэманстрацыі, спрыяюча глядзела на варожыя рабочай клясе выступленьні клерыкалаў.

Конная паліцыя разганяе беспрацоўных.

ВАРШАВА, 9-X. У Лодзі наладзілі дэманстрацыю беспрацоўныя, звольненыя ў свой час з тэкстыльнай фабрыкі Шайблера. Дэманстрацыя была разагнана коннай паліцыяй.

Астрожны бунт прыдушан.

НЬЮ-ЁРК, 5-X. На працягу цэлых сутак цягнуўся бунт у астрозе Каньён-Сіты. Па працягу ночы зьняволеныя забілі 4 асоб астрожнае варты. Яны забівалі іх на адным кожны раз, калі ўлада адхіляла патрабаваньне зьняволеных аб вызваленьні. Перакапаўшыся ў бескарысьнасьці змаганьня, правадыр бунту Даніэльс застрэліў пяцярых сваіх памоцнікаў, а потым і сябе. Рэшта здаліся і былі разброены.

Бунт у Каньён-Сіты—чацьвёрты выпадак астрожнага бунту за апошнія месяцы. Бунты выклікаюцца цеснатою і суровымі абыходзінамі.

Зьезд амэрыканскай фэдэрацыі працы.

НЬЮ-ЁРК, 9-X. У Таронта (Канада) адчыніўся 48 зьезд амэрыканскай фэдэрацыі працы. У справаздачным дакладзе зазначаецца, што фэдэрацыя налічвае 2.093 тыс. сяброў. Гэтая лічба, аднак, разьбіта, саюз гарнякоў, напрыклад, налічвае 400 тысяч сяброў, хоць у выніку леташняй непасьпяхоўнай забастоўкі саюз страціў палову сваіх сяброў.

З часу леташняга зьезду амэрыканская фэдэрацыя працы зрушылася далей направа. Нападкі фэдэрацыі працы на камуністаў і СССР становяцца ўсё больш частымі і суровымі. У Таронта наладжваецца мітынг амэрыканскай лігі прафсаюзнага адзінства з мэтаю выкрыць рэакцыйную сутнасьць амэрыканскай фэдэрацыі працы.

Падарожжа піанэраў з дакладамі аб СССР.

НЬЮ-ЁРК, 9-X. Дэлегацыя амэрыканскіх піанэраў, якая вярнулася з СССР, мяркуе распачаць падарожжа па Амэрыцы з дакладамі аб СССР.

Камсамол—надзейны дапаможнік кампартыі

ПАРЫЖ, 9-X. На зьезьдзе камсамолу ад імя ЦК францускай кампартыі з прывітаньнем выступіў Бонтэ. Спыніўшыся на сутнасьці галоўных пастаноў 10-га пленуму Выканкому Камінтэрну, Бонтэ зьвярнуў увагу зьезду на сацыял-фашысцкую павіцыю францускіх сацыялістаў і сацыялістычнай моладзі, якая (павіцыя) яскрава выявілася ў адзіненьні між сацыялістамі і паліцыяй у часе сутычкі ў Жапі.

Ад імя ЦК камсамолу выступіў Мэртэнс, які заявіў, што камсамол глыбока ўпэўнен у правільнасьці ацэнкі міжнароднага становішча, дадзенай Камінтэрнам, і будзе дапамагаць партыі ў яе рашучай барацьбе з ліквідатарскімі і апартуністычнымі плынямі, змагаючыся супроць іх таксама і ў сваіх уласных шэрагах.

Прамова паўнамоцнага прадстаўніка ўраду БССР пры ўрадзе СССР т. Паўлюкевіча

НА ПАСЯДЖЭНЬНІ СНК СССР І САВЕТУ ПРАЦЫ І АБАРОНЫ АД 6 КАСТРЫЧНІКА.

Тав. Паўлюкевіч у сваёй прамове адзначыў посьпехі прамысловасьці БССР за апошнія гады.

— Валавая прадукцыя 1927-28 году павялічылася на 29 проц. у параўнаньні з папярэднім годам; у мінулым 1928-29 г.—на 47 проц. На 1929-30 год гэты прыроост валавай прадукцыі намячаецца ў разьмеры 65 процантаў. Прамысловасьць за апошнія гады дабілася ў сваёй працы значнага фінансавага эфэкту. Напрыклад, у бягучым годзе прамысловасьць дасьць бюджэту 50 проц. таго, што бюджэт павінен будзе даць прамысловасьці. Такіх суадносін паміж бюджэтам прамысловасьці ня мае ніводная з іншых Саюзных Рэспублік.

Урад БССР мае буйныя посьпехі таксама ў разьвіцьці сельскай гаспадаркі, асабліва ў разьвіцьці не аграмаднанага сэктару. У бягучым годзе пачалося будаўніцтва буйных саўгасаў і калгасаў на Палесьсі, балотная глеба якога да гэтага часу не скарыстоўвалася. Перад урадам БССР стаіць задача арганізацыі шэрагу савецкіх гаспадарак з тэхнічнымі культурамі.

Аналізуючы кантрольныя лічбы, распрацаваныя Дзяржплянам СССР, тав. Паўлюкевіч прыходзіць да выводу, што яны далёка не забясьпечваюць патрэб, прад'яўленых народнай гаспадаркай БССР. Дзяржплян СССР пры распрацоўцы кантрольных лічбаў выкрэсьліў, напрыклад, усе прамысловыя прадпрыемствы, якія намечаны да пабудовы ўрадам БССР, не забясьпечаныя мясцовай сыравінай. Намечанае ў праекце Дзяржпляну фінансаваньне сельскай гаспадаркі БССР для ўзмацненьня тэхнічнай яе моцы таксама недастатковае. Беларускі Урад, напрыклад, зрабіў заяўку на 1500 трактараў на бягучы год, па праекту-ж Дзяржпляну ён павінен атрымаць усяго 300 трактараў.

Тав. Паўлюкевіч выказвае упэўненасьць, што Саюзны Урад аддасьць належную ўвагу БССР, якая значна адстае ў сваім эканамічным і культурным разьвіцьці ад іншых Савецкіх Рэспублік. Саюзны ўрад павінен прыняць некаторыя напраўмі да кантрольных лічбаў на 1929-30 год, якія паставяць БССР на адзін узровень са ўсімі іншымі Саюзнымі Рэспублікамі.

45 міл. рублёў на прамысловае будаўніцтва БССР у 1929-30 г.

МАСКВА, 9. На пасяджэньні Дзяржпляну Саюзу зацьверджаны кантрольныя лічбы прамысловага будаўніцтва Беларусі на 1929-30 г.

Усяго на беларускай прамысловасьці будзе патрачана больш 45 мільёнаў рублёў супроць 48170 тысяч, запатрабаваных ВСНГ БССР. З гэтай сумы на заканчэньне гомельскага заводу сельгасмашын будзе патрачана 2 міліёны руб., на заканьне бабруйскага камбінату—1500 тысяч руб., лесапільнага заводу ў Магілёве—130 тысяч руб., віцебскай швэйнай фабрыкі—940 тысяч руб., магілеўскага мастаўўўскага заводу—1700 тысяч руб., віцебскага шчаціна-шчотачнага камбінату—600 тысяч руб., на капітальныя работы запалкавых фабрык „Кастрычнік" і „Чырвоная Бярэзіна"—720 тысяч, на заканчэньне будаўніцтва менскай кандытарскай фабрыкі—1215 тысяч, барысаўскай макаронай фабрыкі—320 тысяч, віцебскага маслабойнага заводу—700 тысяч руб. Пазасталая сума будзе выдаткавана на новае капітальнае будаўніцтва.

На разьвіцьцё тарфяной прамысловасьці—959 тысяч руб. (пабудова ізаляцыйна-падсьцілачнага заводу, распрацоўка праэкту брыкетнага заводу).

Па шкляной прамысловасьці мяркуецца выдаткаваць 3 міліёны руб. (супроць 2 міліёнаў, якія просіць ВСНГ) на пабудову гуты ў Гомелі. Для павялічэньня выпрацоўкі будаўнічых матар'ялаў пастаноўлена пабудаваць крычаўскі цэментавы завод, 5 цагельных, адзін чарапічны і рад заводаў па вырабу вапны. Усяго на разьвіцьцё прамысловасьці будаўнічых матар'ялаў пастаноўлена выдаткаваць больш 4 міліёнаў руб.

На разьвіцьцё хэмпрамысловасьці мяркуецца патраціць 1710 тысяч руб. Будзе пачата пабудова фасфарытнага заводу, 2 фасфарытных млынаў, заводу магнэзіі, заводу па апрацоўцы касьцей. Па лясной прамысловасьці—будзе будавацца рэчыцкі фанэрны завод, полацкі і гомельскі камбінаты. Разам з сумай, якая адпускаецца на заканчэньне бабруйскага камбінату, на будаўніцтва лясной прамысловасьці Беларусі будзе патрачана 4300 тыс. руб.

Па тэкстыльнай прамысловасьці—на будаўніцтва аршанскага ільнянога камбінату, віцебскіх трыкатажнай і баваўнянай фабрык будзе патрачана 3900 тысяч руб.

На разьвіцьцё беларускай папяровай прамысловасьці мяркуецца выдаткаваць 500 тысяч руб. на будаўніцтва цэлюлёзна-папяровага камбінату ў Бабруйску.

На харчовай прамысловасьці пастаноўлена пабудаваць у бягучым годзе 2 крахмальных заводы і завод па пераапрацоўцы фруктаў.

ПРЫЧЫНЫ АВАРЫІ САМАЛЁТУ З Т. ФАБРЫЦЫУСАМ

МАСКВА, 10-X. Савет па цывільнай авіацыі СССР, заслухаўшы даклад камісіі па расьсьледваньні прычын Сочынскай аварыі, у часе якой загінуў тав. Фабрыцыус, прызнаў, што галоўнаю прычынаю аварыі зьявілася перагружанасьць самалёту і няправільнае разьмеркаваньне яго нагрузкі, недапусьцімая наогул і асабліва пры даных аэрадромных умовах. Усё гэта зьявілася вынікам невыкананьня на лініі правіл нагрузкі самалёту. Лётнік Кадан, які зьяўляецца кваліфікаваным пілётам, ня мала праінструктаваным аб асаблівасьцях канструкцыі самалёту К-4 і падмануты няправільным запісам нагрузкі, слаба выкарыстаў адзін з элемэнтаў кіраваньня—стабілізатар.

Савет па цывільнай авіацыі адзначае, што самалёт савецкай канструкцыі К-4, зьяўляючыся зусім здавальняючай машынай, быў у поўнай спраўнасьці і яго стан ніякага ўплыву па даную аварыю ня меў. Разам з тым савет устанавіў, што высокі процант аварыйнасьці на лініі Укрпаветрашляху за даны сэзон зьявіўся ў выніку ненармальнай і безгаспадарчай пастаноўкі ўсёй лінейнай службы і працы таварыства Укрпаветрашляху. Вопыт эксплёатацыі паветранай лініі Масква—Баку праз Чорнаморскае ўзьбярэжжа вывяў поўную мэтазгоднасьць лініі, добра загружанай пасажырамі і поштаю, таксама маючай вялікае культурнае і палітычнае значэньне. На падставе ўсіх гэтых даных савет на цывільнай авіацыі прызнаў абсалютна неабходным неадкладна злучыць таварыства Дабралёт і Укрпаветрашлях у адзінае авіацыйнае таварыства і зрабіць поўны перагляд усяго асабовага складу і матар'яльнай часткі таварыства Укрпаветрашлях.

Вінаватыя ў аварыі і халатнасьці прыцягваюцца да судовай адказнасьці.

Посьпехі падпіскі на III пазыку.

Беларусь на першым месцы.

МАСКВА. Водпуг апошніх няпоўных даных Наркамфіну СССР, падпіска на III пазыку індустрыялізацыі па СССР дасягнула 730.929.000 рублёў. Такім чынам, да поўнага распродажу пазыкі (750 міліёнаў рублёў) не хапае каля 19-ці міліёнаў рублёў.

З саюзных рэспублік на першым месцы па выкананьні кантрольных лічбаў ідзе Беларусь.

ПАМЯЦІ Т. ЛЕПСЭ.

ПАРЫЖ, 9-X. Унітарны прафсаюз мэталёўцаў агласіў адозву да ўсіх рабочых мэталёўцаў з выказам глыбокага жалю з прычыны сьмерці Лепса, якая зьяўляецца сур'ёзнай стратай для рабочага руху і ў прыватнасьці для мэталёўцаў.

Унітарны прафсаюз заклікае рабочых да масавага ўступленьня ў рэвалюцыйную прафсаюзную арганізацыю мэталёўцаў у памяць Лепсэ.

Новы японскі пасланьнік у Кітаі.

ШАНХАЙ, 9-X. Новы японскі пасланьнік Сабуры перадаў свае паўнамоцтвы нанкінскаму ўраду. У часе перадачы вярыцельных грамат Сабуры заявіў, што ад падтрыманьня прыяцельскіх адносін між Японіяй і Кітаем залежыць мір.

ГУВЭР ХАЦЕЎ ПЕРАШКОДЗІЦЬ АНГЛА-САВЕЦКАЙ ЗГОДЗЕ.

НЬЮ-ЁРК, 9-X. У адказ на запытаньні газэт, у Белым Доме заяўляюць, што пытаньне аб прызнаньні СССР Злучанымі Штатамі не закраналася ў перамовах Макданальда з Гувэрам. Гэтае адхіленьне не выключае магчымасьці абмеркаваньня іншых бакоў «савецкага пытаньня». У некаторых вашынгтонскіх колах думаюць, што Гувэр меў на ўвазе дамагчыся адтэрміноваваньня аднаўленьня англа-савецкіх зносін, але што Гэндэрсон паставіў яго перад зьдзейсьненым фактам і абмен думкамі па гэтым пытаньні стаў поўным. Пакуль ня будзе агалошана супольная заява, перамовы Гувэра з Макданальдам трымаюцца ў суровай тайне. Як паведамляюць, супольная заява ўжо падрыхтоўваецца да друку. Друк ня спыняе аднадушна ўсхваляць Макданальда.

Назначэньне пасла залежыць ад Гендэрсона.

ЛЁНДАН, 8-X. У колах, блізкіх да ўраду, карэспандэнту ТАСС паведамілі што нават сам урад у сучасны момант яшчэ ня ведае, хто будзе ангельскім паслом у Маскве. У гэтых колах падкрэсьліваюць, што назначэньне ангельскага пасла зяўляецца справаю міністэрства замежных спраў і залежыць ад асабістага рашэньня Гэндэрсона, а не ад габінэту ў цэлым.

Прадстаўнік Савецкага Саюзу— у латвійскага прэзыдэнта.

РЫГА, 8-X. Пры перадачы паўнамоцным прадстаўніком СССР Сьвідэрскім прэзыдэнту дзяржавы вярыцельных грамат абодвы падкрэсьлівалі імкненьне да далейшага разьвіцьця добрасуседзкіх адносін між Латвіяй і СССР, а таксама значэньне падпісанага між абедзьвымі дзяржавамі дагавору.

АНГЛІЯ МАНЭЎРУЕ.

ЛЁНДАН, 9-X. Згодна патрабаваньня міністра замежных спраў Гендэрсона, былы аўганскі пасланьнік у Лёндане Шун-Уд-Доўле-хан выехаў з Англіі. У паведамленьні міністэрства замежных спраў зазначана, што захад гэты ня мае палітычнага характару і прадыктаван выключна асабістымі матывамі. Перад высылкаю былога пасланьніка здарыліся скандальныя выкрыцьці. Енус-хан, які распачаў выконваць абавязкі даверанага ў справах Аўганістану, запэўніе, што Шун-Уд-Доўле прысвоіў сабе 40 тысяч фунтаў стэрлінгаў з сум місіі і распусьціў увесь штат пасольства, заявіўшы пры гэтым, што ён дзейнічае са згоды Аманулы. Водпуг слоў Енуса, Шун быў зьмешчан напярэдадні перавароту ў Кабуле, але выкарыстаў адмову Аманулы і прадаўжаў гаспадарыць у лёнданскай місіі.

* * *

ЛЁНДАН, 9-X. Друк індыйскіх сваражыстаў востра крытыкуе намеры ангельскага ўраду адкласьці неадкладнае наданьне Індыі правоў дамініёну.

Кіруючы орган свіраджыстаў „Воля" піша, што ўрад Макданальда, як відаць, рыхтуе новы суровы зьдзек у адносінах да Індыі і спрабуе падмануць масы прыгожымі словамі, не даючы ім права голасу ў справах кіраваньня ўласнай краіны.

Практычна ўдзельнічаюць, а тэарэтычна „вырашаюць".

ПАРЫЖ. Першы пленум нацыянальнае рады сацыялістычнае партыі пасьля яе пядаўняга зьезду ўхваліў зьвярнуцца да выканкому II Інтэрнацыяналу з просьбаю паставіць на парадак дню чарговага кангрэсу II Інтэрнацыяналу пытаньне аб удзеле сацыялістаў у буржуазным урадзе.

На пытаньні аб сутычцы ў Жапі, дзе сацыялістычная моладзь праваквала ўдзельнікаў камуністычнай маніфэстацыі і разам з паліцыяй зьбівала іх, пленум ухваліў спэцыяльную рэзалюцыю. Рэзалюцыя адабрае бясчынствы сацыялістычнай моладзі, якія пленум называе „здольнасьцю абараняць свабоду сходаў".

Бязьлітаснай барацьбой выкарчуем практыку апартунізму.

З прычыны недаабкладаньня памольным зборам млыноў на Аршаншчыне дзяржава страціла сотні тысяч пудоў хлеба. —Папы, кулакі і гандляры ў пашане Аршанскага акрфа.—Старшыня АВК падтрымлівае чужы элемэнт.

МАЦНЕЙ АГОНЬ ПА ТЫХ, ХТО ДАПАМАГАЕ КЛЯСАВАМУ ВОРАГУ!

ПРАЯВЫ ПРАВАГА ЎХІЛУ НА АРШАНШЧЫНЕ.

Пры земляўпарадкаваньні вёскі Нашкавічы, Старасельскага сельсавету, Мсьціслаўскага райёну сялянін Кандэйка Аўрам атрымаў на 7 душ сям'і 11 дзесяцін зямлі ўсіх угодзьдзяў. Гэтай зямлёй ён карыстаўся да 1928 году да таго часу, калі кулак той-жа вёскі Жыгуноў Сяргей, маючы 20 дзес. на 6 душ сям'і захацеў адабраць у Кандэйкі кавалак зямлі плошчаю ў 0,6 дзес. Гэты кавалак вельмі спадабаўся кулаку Жыгунову.

Старасельскі сельсавет ня стаў у абарону Кандэйкі, а парашыў дапамагчы кулаку, ня гледзячы на тое, што гэта зямля належыць Кандэйку і ўкліньваецца ў зямлю апошняга. Дзякуючы таму, што каля зямлі Кандэйкі было яшчэ дзес. тры запаснага фонду, сельсавет склаў праэкт разьмеркаваньня гэтай зямлі, уключыўшы ў праэкт і 0,6 дзес. зямлі Кандэйкі, якая спадабалася кулаку.

Аднак у РЗК праэкт зацьвердзілі толькі ў адносіне двух іншых сялян, якім давалася зямля запфонду, а кулаку Жыгунову адмовілі.

АРШАНСКАЯ АКРЗЕМКАМІСІЯ ЗАСТУПІЛАСЯ ЗА КУЛАКА.

Жыгуноў абскардзіў гэту пастанову РЗК у Аршанскую акрземкамісію і апошняя пакланацілася стаць у абарону кулака. Сваёй пастановай ад 7-IX—28 г. Аршанская акрземкамісія зямлю Кандэйкі перадала сыну кулака Жыгунова (які нібыта падзяліўся з бацькам) толькі таму, што сын кулака аддзяліўся ад бацькі. Тое, што гэты падзел гаспадаркі кулаком быў зроблен фіктыўна і што ў час падзелу сыну кулака было толькі 15 гадоў—акрземкамісію ніколькі ня цікавіла.

З дазволу акрземкамісіі зямлёй серадняка Кандэйкі пачаў карыстацца кулак Жыгуноў. Але сын яго, якому прысудзілі зямлю, паехаў у Ленінград і зямля засталася за бацькам.

Пасьля адезду Жыгунова Сяргея ў Ленінград, Старасельскі сельсавет 4-IV—1929 г. пастанаўляе адабраць зямлю ад Жыгунова, які ня меў самастойнай гаспадаркі і ня меў права атрымоўваць зямлю. Мсьціслаўская РЗК 3 ліпеня г. г. пастанову сельсавету зацьвердзіла. Пастанову РЗК зацьвердзіла на гэты раз і Аршанская АЗК, бо ў складзе яе былі другія людзі. Здавалася-б, што на гэтым канец, і зямлёй зноў будзе карыстацца Кандэйка. Аднак на справе атрымалася, што кулак парашыў не здавацца і шукаць іншае выйсьце. Суды ня хочуць дапамагаць, дык можа ў сельсавеце і РВК дапамогуць. І ён знайшоў кулацкіх прыхільнікаў, сваіх абаронцаў і ў сельсавеце, і ў Мсьціслаўскім РВК. Той самы сельсавет, які выносіў пастанову, што Жыгуноў Сяргей атрымаў зямлю незаконна і пазбаўляў яго гэтай зямлі, на гэты раз ужо склаў акт, у якім вельмі выразна гаворыць, што Жыгунову далі зямлю правільна і што дамаганьні Кандэйкі беспадстаўныя. Сельсавет з усёй рашучасьцю зноў пачаў абараняць кулака.

Справа дайшла да Аршанскай акруговай РСІ. Паслалі запытаньне ў Мсьціслаўскі райвыканком. І РСІ атрымала ад РВК адказ, што дамаганьні Кандэйкі беспадстаўныя. Адным словам і райвыканком выступіў у абарону кулака. Такая даведка была дадзена РСІ Мсьціслаўскім райвыканкомам, ня гледзячы на тое, што ў зямельнай частцы апошняга была ўся справа Кандэйкі, з якой яскрава было відаць, што зямлю далі кулаку, што Кандэйка правы і дамаганьні яго маюць падставу.

Цяпер справу гэту ўжо разглядзела РСІ. Сельсавет аддаецца пад суд, а адносна старшыні Мсьціслаўскага райвыканкому і яго намесьніка справа перададзена на разгледжаньне ў партыйным парадку.

СПРЫЯЛІ ПРЫВАТНЫМ МЛЫНАРАМ.

Ападаткаваньне млыноў памольным зборам да гэтага праводзіў Дняпросаюз прав сваіх інструктароў па памольнаму збору. За імі ніхто не сачыў, іх працу ніхто не правяраў, лічыў яе дастаковай, і ў выніку атрымалася, што дзякуючы гэтаму па ўсёй акрузе было недаабкладаньне прыватных млынароў.

Па аднаму толькі Талочынскаму райёну, дзякуючы палёгкам прыватніку, дзякуючы недаабкладаньню, дзяржава недатрымала 12.000 пудоў хлеба. Прыватны млын у Слаўным быў недаабкладзен на 2400 пуд., астатнія таксама, бо інструктар Дняпросаюзу па памзбору ў Талочынскім райёне п'янстваваў са слаўненскім млынаром і не абыходзіўся без хабароў. Аб гэтым сьведчыць яго пісулька аднаму прыватнаму млынару такога зьместу:

Я вас абклаў на гэты месяц 150 п., на другі 400 п. Я жыву ў Воршы (дакладны адрас). Буду дома тады-та. Падумайце Меркін". У чым сэнс гэтай пісулькі—вядома, камэнтарый не патрэбна.

У Багушэўскім райёне таксама гэтымі днямі выявілася, што Цапкаўскі прыватны млын недаабкладзен на 2700 пуд. І так па ўсёй акрузе. Прыватныя млынары, разам з інструктарамі Дняпросаюзу, укралі ў дзяржавы звыш сотні тысяч пудоў хлеба. І гэта ў той час, калі яго ў округу завозілі для задавальненьня беднаты.

Патрэбна дадаць, што цяпер ападаткаваньне млыноў памзборам перайшло да Саюзхлебу. Але апошні таксама нічога не зрабіў, каб праверыць абкладаньне прыватных млыноў па ўсёй акрузе. Ён толькі праверыў адзін Талочынскі райён і на гэтым спыніўся. Прыватнікі і цяпер карыстаюцца тым хлебам, які павінен быць дзяржаўным. Прыватнікі багацеюць за кошт дзяржавы ў той час, калі дзяржаўныя і кааперацыйныя млыны, як, напрыклад, савгасу „Крывое", сельгаставарыства Яблонка—пераабкладзены. Цяжкасьць ападаткаваньня прыватных млынароў пераносілася на дзяржаўныя і кааперацыйныя млыны. Такое становішча ёсьць і ў сучасны момант. Саюзхлеб яшчэ сьпіць і дае магчымасьць прыватніку нажывацца за дзяржаўны кошт.

АКРФА НЯ БАЧЫЎ КУЛАКА, ГАНДЛЯРА І ПАПА.

Не адставаў ад Дняпросаюзу і Аршанскі акрфінаддзел. Палёгкі і недаападаткаваньне, а то і звальненьне ад падатку тых, хто павінен быў плаціць падатак, мела частае мейсца ў практыцы Аршанскага Акрфа. Гандляры даволі буйныя, як напрыклад Ханін, Ліберман і іншыя, былі ў пашане і ім даваліся адтэрміноўкі на выплату падатку на доўгія тэрміны. Умеў Акрфа праз падатковую камісію паніжаць прыбыткі прыватнікам. Прыватнікам: Чарэйскаму прыбытак зьніжан з 16.000 да 13.000 руб., Аўцыну зьменшаньне зроблена з 31.000 да 29.000 руб. Зразумела, што дзякуючы зьмяншэньню прыбытку, ім зьменшаліся і падаткі.

Папоў таксама баяліся абкладаць, як належыць, і давалі ім палёгкі, паніжаючы падатак. Нават 10 папоў у гэтым годзе акрфа зусім неападаткаваў, лічучы іх „беднякамі". А гэтыя папы на справе павінны былі быць ападаткаванымі. Усе астатнія папы плацілі вельмі малы падатак.

БЕДНЯКА І СЕРАДНЯКА АКРФА НЕ ШКАДАВАЎ.

У той час, калі прыватніка, папа і кулака шкадавалі, давалі ім палёгкі, зьмяншалі падатак для іх, зусім не клапаціліся аб беднаце і серадняку. У Дрыбінскім і Ляднянскім райёнах індывідуальным падаткам абкладалі тыя серадняцкія гаспадаркі, якія мелі па 3-4 наёмных рабочых у разгар жніва і касьбы. Індывідуальным падаткам абкладвалі і бядняцкія гаспадаркі за якіх небудзь 40 руб. неземляробскага прыбытку.

У Аршанскім райёне райфінчастка ападаткавала ў індывідуальным парадку серадняка з в. Новае Сяло, Межаўскага сельсавету, Кулашка Антося за тое, што той у 1926-27 годзе меў пастушка, бо сам быў часова лясьніком, а брат знаходзіцца ў Чырвонай арміі, ды і наогул у гаспадарцы мала працоўнай сілы.

Наадварот, таго, каго патрэбна было абкласьці індывідуальным падаткам—не абклалі. Напрыклад, у той-жа вёсцы Новае Сяло селянін Дзервяед Янка мае 16 дзес. зямлі, карыстаецца наёмнай рабочай сілай, мае машыны, мае каля 500 р. пабочнага заробку, схаваў каня і карову, а таксама і 4 дзес. зямлі пры вучоце аб'ектаў абкладаньня застаўся недастаткова ападаткаваным.

ШЭФЫ АКАЗВАЛІ ДАПАМОГУ ЗАМОЖНЫМ.

Ячэйка і завком заводу „Спартак" шэфствуюць над Каменскім сельсаветам. Дасюль шэфства выяўлялася толькі ў тым, што шэфы прыяжджалі ў сельсавет, не праводзілі сходак, ня мелі сувязі з беднатой, а толькі, нагутарыўшы з сябрамі сельсавету, зьвярталіся дамоў.

Гэтай вясной шэфы зьбіралі попел і пасылалі ў сельсавет брыгаду, якая там рамантавала плугі і бароны сялянам. Каму-ж шэфы аддалі сабраны попел і каму яны рамантавалі плугі? Попел аддалі заможным, а рамонт плугоў рабілі толькі для тых, у каго ёсьць коні.

— Ты бязконны,—казалі шэфы беднаку,—табе плуг рамантаваць ня будзем, бо ён у цябе будзе так ляжаць.

Ніякай дапамогі беднаце, бязконным і сем'ям чырвонаармейцаў шэфы не арганізоўвалі.

Шэфы прымалі ўдзел у перавыбарах сельсавету. Але яны перавыбарамі вельмі ня цікавіліся, і дзякуючы гэтаму ў сельсавет пралез заможнік, радня былога абшарніка Матусэвіча. Гэты заможнік толькі і падтрымліваў заможных, а на беднату не зьвярнуў ніякай увагі. Шэфы заўсёды трымалі сувязь з гэтым заможным сябрам сельсавету і разам з ім дапамагалі кулакам.

Так праяўляецца правы ўхіл на практыцы на Аршаншчыне. З ім вядзецца барацьба, але ў паасобных выпадках яшчэ недастатковая. Ёсьць выпадкі, як, напрыклад, на Мсьціслаўшчыне, дзе да права ўхілу адносяцца прымірэнчаскі і лічаць проста яго непаразуменьнем.

Усе гэтыя прыклады кажуць нам аб тым, што барацьбу з правым ухілам на Аршаншчыне патрэбна ўзмацніць. Яна павінна быць жорсткай у адносінах да тых, хто выходзіць з правільнай клясавай лініі, хто перашкаджае дыктатуры пралетарыяту, хто спрыяе кулаку, папу і прыватніку!

А. Калюжны.

ПАД ВЫСОКІМ „ПОКРОВИТЕЛЬСТВОМ".

Наркамземаўскія кіраўнікі дапамагалі.

Аўсіевіча зьнялі з працы ў Полацкім АкрЗА за цэлы шэраг недапушчальных злачынстваў: за разлажэньне сэкцыі земляўпарадкавацеляў; за скрыўленьне клясавай лініі і прызналі чужым элемэнтам, як былога штабс-капітана царскай арміі з прыдворнай сьвіты.

Згодна загаду Прышчэпава двум невінаватым ні ў чым каморнікам з Полацкага АкрЗА даюцца „воўчыя" білеты", а Аўсіевіч атрымлівае цёплае «месьцечка» акруговага рэвізора па земляўпарадкаваньню ў Віцебскай акрузе.

Завязалася гарачая барацьба. Сэкцыя віцебскіх земляўпарадкавацеляў адчынена ставіць пытаньне:

Нам такія людзі, як Аўсіевіч, не патрэбны, ён пераехаў з Полацку разбураць нашу сэкцыю, ён прыехаў у Віцебск скрыўляць клясавую лінію—гнаць яго з Віцебску!—Гэтак спаткала віцебская сэкцыя земляўпарадкавацеляў Аўсіевіча.

Цэнтральнае праўленьне саюзу работнікаў зямлі і лесу выклікала Прышчэпава на паседжаньне і запытала, чаму ён так абараняе Аўсіевіча, ворага нашай грамадзкасьці. Прышчэпаў цае абавязацельства зьняць Аўсіевіча. Час ідзе. Жыцьцё патанула ў каламуце дзелавой сьпешкі. Некаторыя забылі пра Аўсіевіча, а некаторыя памяталі і ведалі, што гэта вораг грамадзкасьці і сацыялістычнага будаўніцтва, але баяліся выступаць з крытыкай, бо бачаць, што апошні абараняецца НКЗ.

ЦП саюзу выносіць сваю пастанову:

— Зьняць Аўсіевіча з працы. Акрсаюз далучаецца да пастановы ЦП саюзу.

Але справа прымае зацяжны характар. Аўсіевіч працуе і да гэтага часу. Аўсіевічу наадварот акруговае „начальства" складае аўтарытэт і рэкамэндуе як аднаго з лепшых працаўнікоў.

Пад „покровительством" старшыні АВК.

Валодзька (зараз старшыня АВК)—гэта той самы Валодзька, які калісьці працаваў у Наркамземе намесьнікам наркома — Прышчэпава, які калісьці будучы намесьнікам наркома, скарыстоўваў сваё службовае становішча і для сваіх асабістых, уласных спраў.

Валодзька ўстроіў свайго брата ў Беларускую Дзяржаўную сельска-гаспадарчую акадэмію,—даў яму наркамземаўскую стыпэндыю. Брат устраіваецца сакратаром аднэй з навуковых сэкцый на пэнсію і ўстрайвае сваю жонку ў акадэміі загадчыцай бібліятэкі.

Валодзька на кожным кроку імкнецца дапамагчы Аўсіевічу. На акруговым зьезьдзе спэцыялістаў па сельскай і лясной гаспадарцы Валодзька пасьля прывітаньня чамусьці застанавіўся на дзіва ўсёй залі на кандыдатуры Аўсіевіча і пачаў даводзіць.

— Аўсіевіч адзін з лепшых працаўнікоў. Ён аддае ўсе сілы і энэргію на наша сацыялістычнае будаўніцтва. Аўсіевіч адзін з сумленных шчырых працаўнікоў.

У зале ўзьняўся шум. Працаўнікі-спэцыялісты з чыста пралетарскім паходжаньнем з абурэньнам слухалі як „восхваляецца" вуснамі старшыні АВК той чалавек, які зьдуляецца ворагам нашай грамадзкасьці.

Пасьля гэтай прамовы Валодзьні, старшыня акрсаюзу рабземлес (адзін з старых партыйцаў Віцебшчыны відны адказны працаўнік) тав. Жулега пачаў адказваць Валодзьку—каго ён абараняе, дык той замест таго, каб унікнуць у справу, разабрацца хто такі Аўсіевіч, адказаў проста: Досыць вам узьнімаць кампанію супроць Аўсіевіча... Я лічу, што гэта проста „чванства" з боку саюзу.

Пасьля зьезду Аўсіевіч ганарыцца ўсюды; покуль Валодзька будзе ў Віцебску, дык я пляваць хачу на ўсіх.

Адказныя працаўнікі Акрфа, бачачы такое высокае „покровительство", склалі зброю, захавалі справу Аўсіевіча „пад сукно" і ніраз было чуваць:

— Наркамзем прыслаў, Наркамзем няхай і здымае, навошта нам спрачацца, набываць ворагаў, наша справа—старна, мы тут ня прычым. Інакш кажучы, проста ня хочуць спрачацца з Валодзькай, баяцца Валодзькі, напрыклад, загадчык АКРЗА Сатрыцкі, дык той проста ня хоча псаваць добрых, таварыскіх узаемаадносін з галавой акругі.

Хто такі Аўсіевіч.

Аўсіевіч штабс-капітан царскай арміі. Мае „ўзнагароду ордэны з мячамі і бантамі". Увесь час быў адным з выдатных прыдворных цара. У лютаўскую і Кастрычнікавую рэвалюцыю, будучы штабс-капітанам, павышаецца на два чыны. Сам родам з м. Сянно. Зараз Аўсіевіч у Сеньніцкім райёне мае кулацкую гаспадарку: 20 гэктараў пахаці, 2 дамы, розныя с-г. прылады і машыны.

У сучасны момант, калі з Аўсеевічам выпадкова прыходзіцца гутарыць аб царскай Расеі, дык ён з захапленьнем расказвае аб цару, генэралах, падарунках, „самой" імпэратрыцы.

Станіслаў Іва.

ПАДРЫХТУЕМ ЖАНЧЫН-ГРАМАДЧЫЦ,

ПЕРАВЫБАРЫ ДЭЛЕГАЦКІХ СХОДАЎ ПЕРАТВОРЫМ У КАМПАНІЮ ДЛЯ ЎЗЬНЯЦЬЦЯ ВЫТВОРЧАС ПАЛЕПШАНЬНЯ ЯКАСЬЦІ ПРАДУКЦЫІ І ЎЗМАЦНЕНЬНЯ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДА ПЕРАВЫБАРЫ ПАВІННЫ ДАЦЬ У ПАРТЫЮ СОТНІ ЛЕПШЫХ РАБОТНІЦ, БАТРАЧАК І БЯДНЯ

РАБОТНІЦЫ ЎЗДЫМАЮЦЬ ВЫТВОРЧАСЬЦЬ ПРАЦЫ.

Перавыбары дэлегацкіх сходаў па 2 райёну Віцебску праводзяцца пад знакам сацыялістычнага спаборніцтва ўзмацненьня краіны. На перавыбарчым сходзе дэлегатак у рызьнікаў прысутнічала 700 работніц. На сходзе дэлегаткі заявілі, што работніцы пры 39—38 рублёх месячнага заробку падпісаліся на 3-ю пазыку індустрыялізацыі на 117 проц. і ў фонд абароны краіны адлічылі 1 проц., што складае 1.000 руб. У адным цэху дэлегаткі былі застрэльшчыкамі ўзьняцьця прадукцыйнасьці працы на 75 проц. На перавыбарчым сходзе дэлегаткі запісаліся ў брыгаду па сацыялістычнаму спаборніцтву і выклікалі шэраг работніц іншых прадпрыёмстваў. На сёньнешні дзень пасьля сходу, брыгада работніц складзена з 25 чалавек. Работніцы выпісваюць часопісь «Работніца і Сялянка» у ліку 300 экз.

На 1-ай фабрыцы «Прафінтэрн» на перавыбарчым сходзе першай зьмены піджачнага цэху работніцы ў ліку 10 чалавек запісаліся ў брыгаду па праверцы выкананьня дагавораў сацыялістычнага спаборніцтва. Па іншых цэхах і зьменах праводзіцца тое самае.

На акулярнай фабрыцы работніцы аднаго цэху выклікаюць другі па спаборніцтва на 100 проц. наведваньня перавыбарчых сходаў дэлегатак. Рабочыя брыгады там арганізаваны, але невялікая колькасьць работніц ахоплена і праз перавыбарчыя сходы магчыма будзе ахапіць вялікую колькасьць работніц брыгадай. На сьпіртзаводзе арганізавана брыгада, дзе ахоплена 18 работніц. На перавыбарчым сходзе ЦРК 20 чалавек работніц запісаліся ў брыгады праверкі сацыялістычнага спаборніцтва і ўнесьлі 123 руб. у фонд абароны краіны.

На абутковай фабрыцы імя «Лекерта», на перавыбарчым сходзе работніц і жонак рабочых здавалі каштоўныя залатыя і срэбраныя рэчы і грошай на 95 руб. у фонд абароны краіны.

На гэтай-жа фабрыцы работніца Сьцяпанава атрымала прэмію за ўзьняцьце прадукцыйнасьці працы на 50 проц. і за выпуск добраякаснай прадукцыі.

Вайнбэрг.

Палітычна падрыхтаваць.

(Завод „Чырвоная Зорка").

Ямчэ за месяц да правядзеньня перавыбараў дэлегатак былі праведзены агульныя сходы рабочых і работніц заводу з удзелам жонак рабочых; таксама склікаліся сходы па цэхах. На сходах дэлегаткі рабілі справаздачы аб сваёй працы, там-жа былі даклады аб ролі жанчыны ў сацыялістычным будаўніцтве краіны.

З пастаноў сходаў відаць, што практыка мінулых гадоў, што дэлегаткі на заводзе сваёй штодзённай працай шмат зрабілі ў справе барацьбы з рознымі хворымі зьявішчамі быту (п'янствамі, хуліганствам і г. д.).

Перавыбары дэлегатак на заводзе праходзілі пад лёзунгам узмацненьня індустрыялізацыі, пашырэньня культуры і барацьбы за новы быт.

Агульны сход адзначыў, што найбольш працаздольныя дэлегаткі-работніцы заводу і жонкі рабочых павінны пасылацца дзеля падвышэньня сваёй кваліфікацыі ў навучальныя ўстановы і ўцягвацца ў шэрагі партыі.

На сходзе абрана 5 дэлегатак з складу работніц заводу і 4 з складу жонак рабочых.

Зараз, згодна наказу агульнага сходу, арганізаваны пры заводзе 2 гурткі па вышываньні і шыцьці, і палітадукацыі. На час працы матак работніц і жонак рабочых у гэтых гуртках арганізаваны пакой для дзяцей.

С.

Дэлегацкія сходы па Фрунзаўскаму райёну.

Падпісваемся на 3-ю пазыку.—Сацыялістычнае спаборніцтва паміж групамі жанчын.

— Перавыбарчыя дэлегацкія сходы па Фрунзаўскаму райёну, кажа жонарганізатар т. Матылькова,—амаль скончаны.

Сходы прайшлі з вялікім уздымам і надзвычайнай актыўнасьцю з боку работніц і нават рабочых.

На заводзе „Камунар" у часе перавыбарчай кампаніі была праведзена сярод жанок рабочых падпіска на 3-ю пазыку індустрыялізацыі. У перавыбарах удзельнічалі ня толькі работніцы, але і рабочыя з заводу.

На хлебазаводзе жаночы сход ухваліў у абавязковым парадку накіраваць сваіх дзяцей у піонэр-атрады, бо яны значна дапамагаюць выхаваньню дзяцей.

У сваёй рэзалюцыі аб гаспадарчых цяжкасьцях работніцы зазначаюць, што яны адабраюць лінію партыі і будуць усямерна змагацца за выяўленьне хібаў у працы і са скажэньнямі клясавай лініі.

З матар'ялаў перавыбарчага сходу дэлегатак Менсіяга вузла сувязі відаць, што дэлегаткі ў большасьці працавалі кепска, бо ня было правільнага разьмеркаваньня па сэкцыях. У актыўную працу было ўцягнута толькі 5—6 чалавек. Іншыя дэлегаткі лічыліся „мёртвымі душамі".

Дзеля ўзьняцьця актыўнасьці ўдзелу жанчын у сацыялістычным спаборніцтве, жанчыны-працаўніцы Лесбелу па дэлегацкім сходзе ўхвалілі выклікаць на спаборніцтва па палепшаньні выкананьня сваіх абавязкаў—жанчын з апарату ВСНГБ.

У бліжэйшым часе склікаецца супольны сход для абгаварэньня пунктаў умовы. Сярод жанок служачых з посьпехам праходзіць падпіска на 3-ю пазыку.

Асабліва актыўна праходзяць дэлегацкія сходы сярод хатніх работніц. Праведзена 6 справаздачных сходаў.

Выпушчана спэцыяльная насьцэнгазэта, якая ўсебакова асьвятляе кампанію і асноўныя задачы дэлегацкіх сходаў. Сярод хатніх работніц праведзена падпіска на 3-ю пазыку.

Неадкладная задача з ліку новых дэлегатак падрыхтаваць кадры жанчын-грамадчыц, актыўных удзельнікаў нашага будаўніцтва.

Трэба сурова падлічыць няпісьменных сярод новых дэлегатак і ліквідаваць іх няпісьменнасьць.

Сярод дэлегатак трэба ўсямерна ўзмацніць клясава-выхаваўчую працу.

На дэлегацкі сход шчотачнай фабрыкі зьявілася 550 чалавек, работніц і жонак рабочых.

У сваім дакладзе т. Ёфэ—кіраўнік дэлегацкімі сходамі ахарактарызаваў асноўныя моманты працы дэлегатак.

— За апошні час у партыю ўцягнуты тры дэлегаткі-актывісткі. Работніцы прымаюць актыўны ўдзел у сацыялістычным спаборніцтве. На цэхах арганізаваны жаночыя ўдарныя брыгады.

Са справаздачы асобных дэлегатак відаць, што апошнія прымалі актыўны ўдзел у працы сэкцый гарсавету, правялі абсьледваньні беспрацоўных і г. д.

У новы дэлегацкі склад абрана 53 чал.

Сумесны сход старых і новых дэлегатак распрацаваў плян далейшай працы, у якім работніцы абавязваюцца прымаць актыўны ўдзел у сацыялістычным спаборніцтве і ўзьняцьці працоўнай дысцыпліны.

Лепшых работніц, бя чак і бяднячак у пар

(Менская акруга).

Справаздачна-выбарчая кампані гацкіх сходаў праводзіцца пад л выкананьня пяцігадовага пляну, актыўнага ўдзелу работніц у с стычным спаборніцтве, за пра дысцыпліну і зьніжэньне сабекош

На вёсцы дэлегацкія сходы і быць застрэльшчыкамі барацьбы с кулацтва, за ўцягненьне шырокіх бядняцка-серадняцкай і батрацкай жанчын у справе калектывізацыі, могі хлебазагатоўчай кампаніі і ін

Ваенная небясьпека высоўвае намі задачу большага ўцягненьня жа чын у справу іх падрыхтоўкі да аб краіны.

Нам трэба дабіцца поўнай лікі няпісьменнасьці сярод працоўных чын, увядзеньня новага культурнага

Справаздачна-перавыбарчая кампа гораду амаль скончана, у вёсцы яна цягнецца да 15 кастрычніка.

З папярэдніх матар'ялаў відаць кампанія праходзіць пад вялікім мам, пры актыўным удзеле прац жанчын, асабліва батрачак.

На мясцох праведзена вялікая п тоўчая праца па ўцягненьні жанч хлебазагатоўчую кампанію. Так, у лавіцкім райёне арганізаваны ч абоз, выключна жанчынамі-актывіс праводзяцца жаночыя канфэрэнцы розных пытаньнях нашага будаўн Асаблівая ўвага зварачаецца на дзеньне дэлегацкіх сходаў у сав Для большага ахопу батрачак дэлег пунктамі сёлета арганізуюцца сам ныя дэлегацкія сходы савгасьніц і гасьніц (пры паліччы 15-20 чалавек.

Значна пашырана колькасьць н нальных дэлегацкіх сходаў, асабліва скіх. Пры многіх нардомах і хат тальнях упяршыню арганізаваны гацкія сходы.

Для дапамогі нізавым арганізаці правядзеньні перавыбараў мабілі 16 адказных працаўніц для пасыл вёскі.

У далейшым нам трэба строга ўл актывістак-дэлегатак старога скліч для ўцягненьня іх у практычную п

Лепшую частку трэба высоўвац кіруючую працу ў саветы, кааперац і прафсаюзы. Трэба завастрыць ува ўцягненьні лепшых работніц з бат і бяднячак у шэрагі камуністычнай р тыі.

Перавыбары ўзьнялі палітычную тыўнасьць працоўных жанчын. яшчэ больш паглыбіць і пашыры удзел у сацыялістычным будаўніцтв

В

Удзел саветаў у перавыба дэлегацкіх сходаў.

Полацан, 8-10. На пасяджэньні п дыуму акрыканкому стаяла пытань ўдзеле саветаў і райённых выкана камітэтаў у кампаніі перавыбараў ж чых дэлегацкіх сходаў. Вызначана канкрэтных мерапрыёмстваў.

Будзе праверана работа дэлегатак, мацаваных да ўстаноў, і вылучэнн сельсаветаў; абгаварваюцца лепшыя дыдатуры жанчын дзеля прызначэ апошніх на адказную працу ў ро ўстановы. Гарсавет і райвыканком за панавалі правесьці шырокую раст чальную працу па ўцягненьню раб і сялянак у працу саветаў.

Усебеларускі зьезд с.-г. кааперацы

Учора, увечары, у Цэтральным Доме Селяніна адчыніўся усебеларускі зьезд с.-г. кааперацыі.

На зьезд прыбыло да 200 дэлегатаў. У прэзыдыум зьез абраны т. т. Васілевіч, Галадзед, Гантман, Міцькоў, Рачк ні, Крэмэр, Дубіна і інш.

У ганаровы прэзыдыум абраны: т. т. Сталін, Варашыл Молатаў, Калінін, Рудзутак, Рыкаў, Уладзімірскі, Гам нік, Чарвякоў, Арджанікідзе і Крупская.

Перад пачаткам дзелавой работы зьезд паслаў прывітан ЦК УсеКП(б), ЦК КП(б)Б, СНК і ЦВК СССР, СНК і ЦВК БС

Зьезд зацьвердзіў наступны парадак дня: справаздача Б сельсаюзу, рэканструкцыя сельскай гаспадаркі і задача с.-г. апэрацыі, арганізацыйная пабудова с.-г. кааперацыі, даклад р зійнай камісіі, 5-цігадовы плян разьвіцьця па с.-г. кааперацыі

Зьезд адразу прыступіў да дзелавой працы. З вялікім дак дам аб дзейнасьці с.-г. кааперацыі выступіў старшыня праўлен Белсельсаюзу т. Дубіна, у якім ён зрабіў агляд дзейнасьці сыстэ с.-г. кааперацыі за апошнія 2 гады. Сёньня на раньнішнім па джэньні пачнуцца спрэчкі па дакладу т. Дубіны.

Выканаем важнейшую пастанову партыі.

Лістападаўскі пленум ЦК і ЦКК УсеКП(б) вырашыў пытаньне аб неабходнасьці праверыць шэрагі нашай партыі, аб самай рашучай чыстцы ад сацыяльна чужых, што прымазаліся, абюракрачаных элемэнтаў, якія разлажыліся, ад элемэнтаў якія скарыстоўваюць сваё становішча ў кіруючых органах партыі для сваіх карысных і кар'ерысцкіх мэтаў, элемэнтаў дробнабуржуазнага пераараджэньня, якія зрастаюцца з кулацтвам і г. д.

Прышоў час падвесьці першыя вынікі гэтай чысткі, праверыць, наколькі правільна партыя выконвае пастановы лістападаўскага пленуму ЦК і XVI партыйнай канфэрэнцыі. Пакуль праверка яшчэ далёка ня скончана, трэба ўлічыць усе недахопы і памылкі, дапушчаныя да гэтага часу ў гэтай праверцы, для таго, каб, пакуль ня позна, іх выправіць. Партыя мела на ўвазе, што чыстка, якая праводзіцца, зьяўляецца адным з самых сур'ёзных спосабаў самакрытыкі, што гэта праверка партыі магчыма будзе толькі ў тым выпадку, калі шырока будзе разгорнута самакрытыка і самадзейнасьць усёй партыі, калі ўсе магчымасьці ў гэтым напрамку будуць скарыстаны, калі будзе разгорнута вялікая работа на падставе ўнутрыпартыйнай дэмакратыі.

Другая, ня менш важная задача, якую ставіла сабе партыя пры чыстцы і праверцы сваіх шэрагаў, была задача вярбоўкі новых членаў партыі з асяродку рабочых і работніц, асабліва рабочых і работніц буйных вытворчых прадпрыёмстваў, батракоў і беднякоў.

Трэцяя задача, якую ставіла сабе партыя, гэта была задача ўзмацніць работу арганізацыі, праверыць работу ячэйкі, стварыць больш таварыскія ўзаемаадносіны паміж членамі партыі, павялічыць пачуцьцё адказнасьці кожнага за палітыку, за лёс усёй партыі, даць штуршок да павышэньня ўзроўню палітычных ведаў, узмацніць барацьбу з бюракратызмам, узьняць актыўнасьць усіх членаў арганізацыі, узмацніць сувязь іх з масамі рабочых і сялян, узмацніць актыўны ўдзел у сацыялістычнай перабудове вёскі, у рацыяналізацыі вытворчасьці і кіраўніцтве, ва ўзьняцьці працоўнай дысцыпліны, у адхіленьні ўсякага роду непатрэбстваў і г. д. Партыйныя пастановы падкрэсьлілі, што ўся партыя павінна зьвярнуць увагу на выкананьне гэтай задачы. Само сабой зразумела, што да гэтай задачы павінна быць прыцягнута ўвага і іншых грамадзкіх арганізацый, зьвязаных з партыяй, на якія партыя абапіраецца,—прафсаюзы, камсамол. Само сабой зразумела, што **ўвесь друк** павінен быў аддаць належную ўвагу гэтаму, што неабходна было паставіць праверку таго, як выконваюцца пастановы партыі, уважліва сачыць за ходам усёй праверкі і выпраўляць на ходу недахопы, памылкі, а галоўнае—трэба было выканаць вялізарную падрыхтоўчую работу.

Ці выканана ўсё гэта? Ці зроблена ўсё гэта так, як гэтага вымагаюць пастановы партыі, як гэтага вымагаюць інтарэсы рабочай клясы? У сучасны момант цяжка яшчэ зрабіць канчатковыя вынікі, але сякія-такія папярэднія вынікі ўжо бясспрэчна намячаюцца і гэтыя вынікі змушаюць нас сказаць аб тым, што **важнейшая задача, пастаўленая партыяй, выканана недастаткова, што яна патрабуе ўзмацненьня ўвагі ўсёй партыі.**

Праверана частка вясковых ячэек, а дзе-нідзе праверана вясковыя ячэйкі поўнасьцю, прычым згодна ня зусім дакладных даных мы маем у вясковых арганізацыях: выключаных *) 15,2 проц. тых, што выбылі дабраахвотна і мэханічна —1,6 проц. Такім чынам пасьля праверкі вясковых ячэек, прыблізна, на 15 проц. зьмяняецца іх склад. Трэба мець на ўвазе, што апэляцыя нешта ў гэтай адносіне зьменіць. Процант выключаных, бязумоўна, зьнізіцца, але пакуль што вясковыя арганізацыі зьмяняюць свой склад прыблізна на адну шостую.

За што-ж выключаліся члены вясковых ячэек? Як чужыя элемэнты, і за сувязь з чужымі элемэнтамі выключана 20 проц., за злачынствы крымінальнага парадку, растраты, хабары, падлогі, прыблізна 9,2 проц., за адмаўленьне ад уваходжаньня ў сельска-гаспадарчыя калектывы — 6,4 проц., за скарыстаньне службовага становішча 2,2 проц., за ўтаеньне хлебных лішкаў — 3,6 проц., за выкрыўленьне клясавай лініі—2,1 проц., за выкананьне рэлігійных абрадаў і антысэмітызм—4,6 проц., за бюракратызм—0,8 проц. Вось асноўныя повады да выключэньня. Калі мы зьвернемся да рашэньняў партыі, і да тых інструкцый, якія даваліся партыяй у адносіне вясковых ячэек, то мы ўбачым, што ў гэтай адносіне партыя да чысткі ў асноўным падышла правільна.

Аднак, мы павінны сказаць, што **некаторыя даныя змушаюць нас сумнявацца ў тым, што гэта задача выканана поўнасьцю так, як гэтага патрабуюць інтарэсы пралетарыяту.** Далёка ня ўсюды была разгорнута патрэбная падрыхтоўка і забясьпечана патрэбная самакрытыка, у некаторых мясцох праверка праходзіла занадта пасьпешна, бяз вучоту работы камуніста ў вёсцы і без дастатковай увагі да тых скаргаў, якія выходзілі з асяродку беспартыйных сялян.

Але асабліва мы лічым неабходным зьвярнуць увагу на далёка няскончаную праверку нявытворчых і вытворчых ячэек у гарадох. Ленін раіў „пакінуць у партыі толькі сьвядомых і адданых камунізму», каб у партыі засталіся „добрасумленна адданыя рабочай дзяржаве, толькі сумленныя працоўныя, толькі сапраўдныя прадстаўнікі прыгнятаемых пры капіталізьме мас". А між тым першыя вынікі чысткі прыводзяць да таго, што ў нявытворчых ячэйках процант выключаных ніжэй, чымся ў ячэйках вытворчых.

Гэта прымушае нас трывожна настроіцца ў адносіне да таго, наколькі правільна выконваюцца пастановы партыі аб чыстцы нявытворчых ячэек і наколькі правільна падыходзяць да чысткі вытворчых ячэек. Бо няма ніякага

НА ВАРЦЕ КРАІНЫ САВЕТАЎ

Сацыялістычнае спаборніцтва—сродак узмацненьня баяздольнасьці Чырвонай арміі і абароназдольнасьці краіны

Падрыхтоўка камандняга складу запасу—найважнейшая задача сёньняшняга дня.

А ЎПАРТУЮ ПЛЯНАВУЮ ВУЧОБУ

Маноўры скончаны. Часткі Чырвонай арміі варочаюцца на зімовыя кватэры, каб распачаць вельмі адказную працу прыёму маладняка і правесьці апошнюю работу па звальненьню ў доўгарміновы водпуск чырвонаармейцаў 1905 году нараджэньня.

Маноўры, якія ахапілі значную частку Беларусі і накіравалі савецкую грамадзкасьць у бок пытаньняў абароны краіны, далі вельмі добрыя вынікі, якія зараз-жа павінны быць замацаваны.

Савецкая грамадзкасьць, асабліва сялянства стала лепей, правільна разьбірацца ў пытаньнях вайсковай неабходнасьці і мірнай палітыцы партыі і савецкай улады. Рапей сялянства, асабліва малапісьменнае верыла розным чуткам аб вайне і г. д. За час маноўраў гэтыя чуткі ў большасьці расьсеяны. Трэба далейшай работай па растлумачэньню міжнароднага і ўнутранага становішча наказваць рэальнае становішча з нагрозай ваеннай небясьпекі.

Але асабліва важна зараз-жа скарыстаць тую вялікую зацікаўленасьць да вайсковых ведаў, якую мы маем з боку працоўных, як вынік усёй падрыхтоўчай работы да маноўраў і саміх маноўраў.

Ужо цяпер трэба думаць і падрыхтоўвацца да зімовай вучобы на васпітацыі. Трэба рыхтаваць матар'яльную базу і кадры.

У мінулым годзе па наасобных арганізацыях мы ня мелі дастатковай падрыхтоўкі да гэтай работы і ў час работы, а не да яе пачатку, партарганізацыям прыходзілася выпраўляць памылкі, што адбівалася на рабоце.

Падрыхтаваца да скарыстаньня зваільняемых з шэрагаў Чырвонай арміі для работы па васпітацыі насельніцтва таксама трэба.

Трэба падумаць і над зьместам і мэтадамі работы, бо часта мы на «10 аз бяром атакай адну і тую-ж вышыню і ўсё дрэнна»—цэлымі гадамі думачым стральбу тым, хто яе ведае, і не прыстасоўваем выкладаньня да ведаў слухачоў. Такім арганізацыям, як ДА-Авіяхім, Чырвоны Крыж трэба падрыхтавацца, улічваючы памылкі мінулага году.

Маноўры далі нам вельмі яскравы малюнак тых братэрскіх узаемаадносін, якія існуюць паміж Чырвонай арміяй і працоўнымі. Гэтыя ўзаемаадносіны набылічыліся, насельніцтва стала зразумела клясавую ролю Чырвонай арміі. Шэфская работа павінна зараз-жа прыйсьці ў свой звычайны парадак, ня болей, што дэмабілізацыя і прыём новага складаюць належныя ўмовы да разгортваньня гэтай работы.

Усе падставы, а асабліва вялікая зацікаўленасьць працоўных ёсьць, трэба штодзённай, упартай падрыхтоўчай работай забясьпечыць своечасовую, цікавую і якасную вучобу па васпітацыі насельніцтва.

С. К.

Наш „нядзельнік".

У сьвята калектывізацыі па дакладу прадстаўніка ад Калгасаюзу чырвонармейцы №-га стралковага палка выпусцілі прапанову аб арганізацыі „нядзельніка". Было даручана камандаваньню падшукаць працу. У хуткім часе праца была знойдзена па ўкладзе насьпнай дарогі. «Нядзельнік» прайшоў восьць арганізавана, чырвонаармейцы працавалі з вялікай ахвотаю. За дзень зароблена 740 руб., з якіх 50 проц. адлічана на карысьць чырвонаармейскай камуны на Мар'інскіх балотах (Барыйшчына), а 50 проц.—у фонд пабудовы танку імя тав. Фабрыцыуса—чэмпіяна камандзіра нашай Беларускай дывізіі.

Я.

Падрыхтуем начсклад запасу.

У кастрычніку-лістападзе бягучага году па ўсяму СССР распачнецца рэгулярная добраахвотная перападрыхтоўка начскладу запасу.

Асноўнымі формамі вучобы будуць курсы на перападрыхтоўцы начскладу пры дамах Чырвонай арміі, пры вайскова-навучальных установах і пры буйных прамысловых прадпрыёмствах. Апроч гэтага, будзе арганізавана па-за курсавая вучоба ў выглядзе вайсковых гульняў, выхадаў у поле, лекцый і дакладаў на розныя стралкова-тактычныя тэмы.

Асноўная мэта перападрыхтоўкі—даць начскладу запасу тэарэтычныя вайскова-палітычныя веды і практычныя навыкі, якія патрэбны яму для камандаваньня падразьдзяленьнямі ў ваенны час і для штодзённай вайсковай працы сярод працоўных.

Які вынік можна зрабіць з вопыту праведзенай перападрыхтоўкі начскладу запасу ў гэтым годзе?

Патрэбныя веды і навыкі працы начсклад запасу атрымаў.

Доказам гэтага і іншых дасягнутых посьпехаў зьяўляецца цэлы шэраг выпускаў, зробленых курсамі ТДА-Авіяхіму.

Начсклад запасу, як галоўны кіраўнік ТДА-Авіяхімаўскай работы, павінен стаць на чале усіх грамадзкіх арганізацый па ўтварэньні рознага роду курсаў і гурткоў. З восені 1929 году трэба ахапіць перападрыхтоўкай, па згодзе з ваенведам, ня толькі начсклад запасу пяхоты, але і іншых спэцыяльнасьцяў.

Распрацоўваючы розныя перапрыёмствы на па-за курсавой вучобе начскладу запасу ў выглядзе вайсковых гульняў, выхадаў у поле, лекцый, дакладаў, ТДА-Авіяхімаўскія арганізацыі ўпор у сваёй працы павінны зрабіць на прапрацоўку групавой тактыкі, на новы палявы статут, на вывучэньне сучаснай тактыкі як сваёй, так і бліжэйшых супраціўнікаў і па палітасьветную працу.

Наасобныя таварышы, а таксама цэлыя арганізацыі, павінны пайсьці насустрэч начскладу запасу ў аслабаненьні яго ад лішняй грамадзкай і партыйнай нагрузкі, у скарачэньні доўгіх камандыровак, у пераходзе на дзённыя зьмены работы. Гэта палепшыць наведваньне, падвысіць якасьць вучобы, узмацніць прыток і выпуск перападрыхтаваных камандзіраў. К. С.

Далей пашырыць дасягненьні.

Першае падагуленьне выпікаў сацыялістычнага спаборніцтва, зробленае Рэвваенсаветам СССР, гаворыць аб тым, што найбольш выразныя станоўчыя вынікі ў баявой і палітычнай вучобе дасягнуты там, дзе больш усяго ўжыт мэтад сацыялістычнага спаборніцтва.

Простым вынікам сацыялістычнага спаборніцтва зьяўляецца павышэньне процанту выкананьня заданьняў па стральбе, павышэньне баяздольнасьці чырвонаармейцаў, узмацненьне вайсковай дысцыпліны і паляпшэньне бытавых умоў часьцей.

Вось некалькі паказальных фактаў. У часе вучэбнай і баявой стральбы на палігоне, 1-я батарэя артдывізіёну № стралковага палка паказала добрыя вынікі. Наогул, гэта батарэя ні з адной стрэлкіны не прыяжджала без падзякі.

Батарэя ідзе першай толькі таму, што кожны чырвонаармеец добра ведае дагавор аб сацыялістычным спаборніцтве і ўсе натугі накіроўвае на тое, каб яго выканаць.

4-е аддзяленьне стралковага ўзводу № палка ў выніку спаборніцтва павялічыла выкананьне стральбы з 33,3 да 70 проц.

Вялізарнае выхаваўчае значэньне сацыялістычнага спаборніцтва асабліва выявілася на шматлікіх франтох перараджэньня чырвонаармейцаў-гультаёў, лежабокаў, якія адсталі ў вучобе,—у добрых і прыкладных байцоў.

Тут, з асаблівай яскравасьцю апраўдаліся словы тав. Сталіна: „Сацыялістычнае спаборніцтва гаворыць: адны працуюць дрэнна, другія—добра, трэція—лепей, даганяй лепшых і дамажыся агульнага ўздыму"

У выніку таго-ж сацыялістычнага спаборніцтва значна павялічылася зацікаўленасьць чырвонаармейскіх мас да ўсіх пытаньняў жыцьця і вучобы Чырвонай арміі, што ў сваю чаргу патрабавала ажыўленьня і ўзмацненьня кіраўніцтва з боку камандняга і палітычнага складу работай падпарадкаваных ім часьцей.

Чырвоная армія ўжо мела магчымасьць правяраць камуністычны спосаб сваёй працы ў умовах, блізкіх да баявых. На манэўрах гэтага году з асаблівай яскравасьцю пацьвердзілася тое, што **сацыялістычнае спаборніцтва шырока разгортвае творчую самадзейнасьць, ініцыятыву чырвонаармейскіх мас і начальніцкага складу.** Ня трэба тут прыводзіць факты дзівосных паходных рухаў на манэўрах, выключных выпадкаў выносьлівасьці, выяўленьня находлівасьці, адданасьці, рашучых баявых дзейнічаньняў. Трэба толькі адзначыць, што вялікая большасьць гэтых фактаў непарыўна зьвязана з сацыялістычным спаборніцтвам.

Трэба замацаваць і разьвіць дасягненьні сацыялістычнага спаборніцтва і выклікаць новую творчую самадзейнасьць чырвонаармейскіх мас.

Сур. Асьлібекян.

За захаваньне аблігацый 2-й пазыкі.

Кастрычнік зьяўляецца апошнім месяцам выплаты падпіскі на 2-ю пазыку сярод чырвонаармейцаў тэрміновай службы.

Некаторыя ўжо цяпер нагаварваюць, ці не, мэтазгодна будзе пры атрыманьні аблігацыі замяніць на грошы...

Дырэктывы аб захаваньні аблігацый у касах ашчадкасьці ў нашым палку прапрацаваны недастаткова. Бадай, ня толькі ў нашым, а і ў другіх палках такія зьявішчы маюць месца.

Трэба будзе яшчэ раз шырока разгарнуць працу сярод чырвоаармейцаў за захаваньне аблігацый у касах ашчадкасьці.

Буглак Янка.

Пазыка сярод перамоньнікаў.

Пераменны склад І-й стралковай роты №-га палка ў часе прабываньня на зборы падпісаўся на 380 руб. Пры падпісцы разгарнулі сацыялістычнае спаборніцтва, пачынаючы ад разьдзелу і канчаючы асобнымі байцамі. У выніку—падпіска ахапіла нават і тых, хто дома падпісаўся рапей.

Першы ўзнос ужо здадзен.

Касы ашчадкасьці па атрыманьні грошай з палка павінны паведаміць падпісчыкаў на пазыку, бо, адыходзячы дамоў, некаторыя казалі: „Адкуль я буду ведаць, калі і куды мае грошы з падпіскай перададуць".

Трэба на гэта зьвярнуць увагу.

Б.

Вёска павінна выканаць кантрольную лічбу.

Адпор кулаку, які зрывае падпіску.

Мабілізацыя бядняцка-серадняцкага актыву—асноўная ўмова для пасьпяховага правядзеньня кампаніі.

Рэалізацыя пазыкі па рэспубліцы наогул ідзе з посьпехам. На 1-га кастрычніка агульная сума рэалізацыі па БССР дасягнула — 14.056.600 р., ці 124,9 проц. вызначанай для БССР кантрольнай лічбы. Першымі па выкананьню агульнай кантрольнай лічбы ідуць: Віцебская акруга—141,8 проц., Гомельская—133,5 проц. і Полацкая—130,8 проц.

Рэалізацыя пазыкі сярод рабочых і служачых па БССР складае 12.290.200 р. перавысіўшы заданьне па гэтай катэгорыі на 36,6 проц. Кантрольныя лічбы выканалі з перавышэньнем усе акругі. Асабліва-ж трэба адзначыць наступныя: Полацкая — выканала 150,2 проц. кантрольнай лічбы, Віцебская—149,1 проц., Магілеўская—142,5 проц., Гомельская—141,9 проц

У разьмяшчэньні пазыкі індустрыялізацыі, побач з вялізарным посьпехам у горадзе, мы маем няпоўны 100 проц. ахоп рабочых і служачых як па колькасьці, так і па фонду зарплаты.

Маючы на ўсіх гаспадарча-палітычных вучастках посьпехі, мы адначасова маем і шэраг недахопаў, якія з улясьцівай нам актыўнасьцю павінны быць настойліва і зараз-жа зьнішчаны. Да гэтага часу рэалізацыя пазыкі ў вёсцы ідзе невдавальняюча. У кампанію ня ўцягнуты асноўныя масы сялянства. У той час, як рабочыя і служачыя пры 75 проц. ахопе перавысілі сваю кантрольную суму, вёска дала толькі 908.500 р.—60,6 проц.

Кепскае становішча з разьмяшчэньнем пазыкі ў вёсцы сярод сялянства тлумачыцца слабым удзелам у распаўсюджваньні пазыкі органаў на мясцох, бязьдзейнасьцю камісій садзейнічаньня, слабым удзелам у кампаніі грамадзкасьці і г. д. Маюць таксама месца хістаньні, панікёрства. Разважаньні асобных панікёраў, правільней тых, хто ня ўмее працаваць, хто ня можа правіць ініцыятыву, што сяляне не дадуць, ня могуць даць вызначаную да рэалізацыі суму,—ні на чым не абгрунтаваны. Факты—упартая штука, а факты гавораць. У тых мясцох, дзе праца па распаўсюджваньні пазыкі пастаўлена на належную вышыню, дзе агітацыйныя і арганізацыйныя мерапрыемствы скарыстаны, дзе няма панікёрства, там пазыка ідзе добра; дзе гэтага няма—там і рэалізацыя пазыкі ідзе чарпашым крокам.

Аб гэтым гавораць наступныя прыклады:

У Магілеўскай акрузе, Клімавіцкі раён выканаў кантрольную лічбу сярод сялян больш як на 100 проц.

У Мазырскай акрузе Юравіцкі раён выканаў кантрольную лічбу на 149,3 проц. і Лельчыцкі—на 90,3 проц.

У Бабруйскай акрузе Старобінскі раён кантрольную лічбу выканаў на 107 проц.

Ёсьць цэлы шэраг выпадкаў, калі бядняцкая частка сялянства, якая вызвалена ад сельска гаспадарчага падатку, падпісваецца на пазыку і выклікае сялян іншых вёсак зрабіць па іх прыкладу.

Ёсьць і адваротныя факты. У Дабрамысьлінскім с.-с., Віцебскай акрузі, член с.-с. Левенкова выступіла на сходзе сялян, прысьвечаным пазыцы з яўна кулацкай агітацыяй («Для каго выпусьцілі пазыку? Хай яе самі бяруць») і сарвала падпіску.

Падобны выпадак меў месца ў вёсцы Нізы і Жары, таксама Віцебскай акрузі, дзе члены с.-с. Клецкін і Зубава на сходзе сялян гэтых вёсак выступілі з заявамі, што «савецкая ўлада ашуквае вас пазыкай, не паддавайцеся на вудачку. Ня трэба нам аблігацый».

Дрэнна праходзіць рэалізацыя і ў Котаўскім с.-с., дзе зусім не працуе камісія садзейнічаньня. Кантрагэнты не адчуваюцца ў сваёй працы, падпіска афармляецца дрэнна і праходзіць самацёкам. З 1200 р. падпіскі аформлена ўсяго толькі 260 р. Грошы здаюцца без разьліковых квіткоў, «на совесьць». У зьвязку з гэтым сяляне ня маюць давер'я да кантрагэнтаў і ня купляюць пазыкі.

Ёсьць факты, якія гавораць ня толькі аб дрэннай рабоце мясцовых органаў па распаўсюджваньні пазык, а і сьведчаць аб тым, што нашы органы на мясцох засьмечаны кулацкімі, варожымі нам элемэнтамі, якія падрываюць нашу работу. Кулак ня сьпіць, ён „працуе" і там, дзе добра пастаўлена арганізацыйная работа, не гаворачы ўжо пра тое, дзе яна вядзецца кепска. Наша грамадзкасьць пагэтаму павінна ўдарыць самым рашучым чынам у першую чаргу па нашай расхлябанасьці, сьпячцы; толькі тады можна будзе дэзарганізатарскай, правакацыйнай рабоце кулацтва супроць пастаўкі арганізаванасьць і згуртаванасьць беднаты, згуртаванасьць бядняцка-серадняцкага актыву. Зламаць супраціўленьне клясавага ворага, мабілізаваць бядняцка-серадняцкі актыў—асноўная ўмова да пасьпяховага правядзеньня кампаніі.

Але гэтага нам недастаткова. Мы ня толькі павінны весьці барацьбу з кулацтвам, але трэба прымусіць яго даць свае сродкі ў пазыку дзяржаве; гэта можна і трэба зрабіць.

Рэалізацыя пазыкі ў вёсцы зьяўляецца адным з важных вучасткаў фронту клясавай барацьбы. Пагэтаму глыбока памыляюцца тыя таварышы, якія думаюць, што справа распаўсюджваньня пазык—справа НКФіну і камісій садзейнічаньня. Практыка распаўсюджваньня 3-е пазыкі, як і іншых, паказала, што ў такіх кампаніях, як у фокусе, адбіваецца клясавая барацьба.

Адгэтуль—мала біць кулака, які імкнецца сарваць нашу кампанію; патрэбна рашучая барацьба з тымі настроямі сярод сельскіх актывістаў і асабліва сярод партыйцаў, якія думаюць без грамадзкага ўплыву, без барацьбы атрымаць на сацыялістычнае будаўніцтва сродкі ад кулака.

Процант рэалізацыі пазыкі ў вёсцы, які мы маем (60,6 проц.), недастатковы. Па асобных акругах мы маем наступныя вынікі выкананьня кантрольных лічбаў рэалізацыі сярод сялянства: Бабруйская—52,0 проц., Віцебская—76,7 проц., Гомельская—47,3 проц., Менская—52,4 проц., Магілеўская—62,0 проц., Мазырская—57,4 проц., Аршанская—71,6 проц., Полацкая—70,6 проц.

Рэалізацыя пазыкі сярод неарганізаванага насельніцтва БССР дала 857.900 руб., ці 114,4 проц. кантрольнай лічбы. Але трэба адзначыць, што пры агульным выкананьні кантрольнай лічбы па рэспубліцы недастаткова праведзена работа, і ня выкананы кантрольныя лічбы наступнымі акругамі: Аршанская—53,6 проц., Магілеўская—59,4 проц., Менская—71,0 проц., Полацкая—72,3 проц.

Наглядаецца недастатковая праца на мясцох па ахопу падпіскай саматужнікаў. Так, у Бабруйску з 1.000 чал. саматужнікаў-адзіночак падпіскай на пазыку ахоплена толькі 200 чал.

Кепска абстаіць справа з падлікам сялянскай падпіскі. Некаторыя месцы паведамляюць павялічаныя лічбы рэалізацыі пазыкі сярод рабочых і служачых.

Трэба са ўсёй настойлівасьцю ва ўвесь рост паставіць праблему рэалізацыі пазыкі ў вёсцы.

Ніякіх адгаворак, ніякіх хістаньняў, цьвёрды і рашучы адпор кулацкай контр-агітацыі. Увага ўсёй грамадзкасьці і яе працы на бліжэйшы перыяд часу павінна быць прыкавана да рэалізацыі пазыкі на вёсцы, таксама як і да захаваньня ранейшых пазык.

Трэба цьвёрда памятаць, што выкананьне пляну вялікіх работ патрабуе максымальнага ўдзелу ў будаўніцтве сродкаў самога насельніцтва.

Вось чаму ўвага да распаўсюджваньня пазыкі ня можа быць ня толькі паслаблена, але ўзмацнёна, а ў вёсцы яна павінна быць разгорнута і паглыблена ня менш, чым у горадзе.

Львоў-Гурскі.

Па Беларускай ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

1 проц. на абарону краіны.

Смалявічы, 10-X. Рабочыя і служачыя Смалявіцкага райкамбінату падпісалі ўмову аб аблігацыі з заработку ў карысьць абароны краіны 1 проц. у працягу году і выклікаюць зрабіць па іх прыкладу: 2 барысаўскія камбінаты, бярэзінскі, чэрвенскі, сьмілавіцкі, койданаўскі, вузьдзінскі, астрашыцка-гарадзецкі, пухавіцкі, бягомльскі, халопеніцкі, плешчаніцкі, заслаўскі, копыскі, лагойскі, грэскі і самахвалавіцкі!

А. І. Грэк.

Хлебазагатоўкі на Лепельшчыне пад пагрозай зрыву.

ПОЛАЦАК, 10-X. Па акрузе, у тым ліку ў Лепельскім раёне, распачалася хлебазагатоўчая кампанія, у правядзеньні якой выяўлена ўжо шэраг вялікіх недахопаў.

У Лепелі нават яшчэ не падрыхтаваны належныя памяшканьні. Загадчык Несінскай крамы адмовіўся прыняць ад сялянина прывезены хлеб. Памім хлебазагатоўцамі існуе канкурэнцыя. Старшына Казенскага таварыства арганізуе там звычныя „сакрэтныя абозы" і робіць усё, каб пра іх ня ведалі іншыя загатаўцы.

Памылкі ў загатоўчай кампаніі трэба выправіць.

На беспераныны тыдзень.

Полацак, 10-X. На гэтых днёх прамкамбінат, рабочыя гарадзкой электрастанцыі, полацкі райком партыі, а таксама райвыканком перайшлі на беспераныны рабочы тыдзень.

У хуткім часе пераходзіць на беспераныны тыдзень полацкі акругком партыі.

Будуем крахмальныя заводы.

Гомель, 10-X. На пасяджэньні акрыляну абмяркоўваліся праэкты новых крахмальных заводаў. Нарада прызнала мэтазгодным будаваць крахмальныя заводы ў Буда-Кошалеўскім і Чачэрскім раёнах. Гэтыя раёны маюць дадатковую колькасьць бульбы для забясьпечаньня заводаў. У Буда-Кашалёўскім раёне завод будзе будаваць Белхарчтрэст, а ў Чачэрскім—Сельхарчтрэст.

Рабочыя брыгады—у вёску.

Магілеў, 8-X. АПО на апошнім сваім пасяджэньні пастанавіў ва ўсіх раёнах акругі паслаць рабочыя брыгады ў дапамогу хлебазагатоўкам і правядзеньні „Дню калектывізацыі". 4 кастрычніка 7 брыгад ужо выехала, а гэтымі днямі выяжджаюць астатнія.

Брыгады складаюцца з 3—7 чалавек.

Плян Белкалгассаюзу выкананы на 200 проц.

Гомель, 8-X. Лёзунг партыі—„наперад да буйнага калгаснага будаўніцтва"—ажыцьцяўляецца. Калектывізацыя сельскае гаспадаркі з кожным днём набывае масавы характар. У бягучым годзе плян Белкалгассаюзу выкананы з перавышэньнем на 200 проц. Ва ўсіх раёнах акругі арганізаваны буйныя калгасы. У наступным годзе мае быць занята пад новыя калкасы да 150 тысяч гэктараў. Лоеўскі раён мае быць ператвораны ў раён масавай калектывізацыі.

Дзеля гэтага калгассаюз ужо прыняў захады да ўкамплектаваньня раёнаў агранэрсаналам. Намячаецца арганізаваць 18 кустоў, якія будуць аб'яднаць 75 калгасаў. Для падрыхтоўкі кваліфікаваных працаўнікоў у калгасы ў бліжэйшым часе адчыняцца розныя курсы.

Бюракраты зрываюць арганізацыю радыё-вузла.

Барысаў, 8-10. Прафарганізацыі арганізавалі радыё-вузел, прызначаны для абслугоўваньня ўсіх фабрык, заводаў і рабочых кватэр. Першыя перадачы аказаліся пасьпяховымі, але па віне бюракратаў барысаўскай паштовай канторы гэта справа зрываецца. Ня гледзячы на дагаворанасьць, паштова-тэлеграфная кантора тармазіць работу радыё—ня ўключае абанэнтаў і інш.

Трэба зьнішчыць гэтыя непарадкі.

Паляпшаецца ахова народнага здароўя.

Гомель, 10-X. Мэдыцынская дапамога ў акрузе паляпшаецца. У Лоеве пачалася пабудова новай бальніцы, на пабудову якой адпушчана 65 тысяч рублёў. У Нова-Белицы пасьпяхова будуецца дыспансэр для хворых на сухоты. Адчыняюцца 5 пунктаў для абслугоўваньня батрацтва. У Камарыне фэльшарскі пункт рэарганізуецца ва ўрачэбна-амбуляторны.

Крэдытнае т-ва ня зьбірае закантрактаванага хлеба.

Барысаў, 8-X. Першы тэрмін здачы хлеба па кантрактацыі скончан. Індывідуальныя гаспадаркі да гэтага часу здалі 30 проц., якія павінны былі здаць да першага тэрміну. Крэдытнае таварыства ня прымае ніякіх захадаў і не вядзе ніякай работы па спагнаньні збожжа.

Абсьледваньне працы зямельных органаў.

(Полацак).

У сувязі са зяўленьнем у друку матар'ялаў аб скрыўленьні клясавай лініі ў зямельнай палітыцы на Полаччыне акруговы камітэт партыі пастанавіў зрабіць на працягу месяца абсьледваньне акруговых і нізавых зямельных органаў.

„Савецкая Беларусь" своечасова забіла трывогу аб праявах „прышчэпаўшчыны" ў Полацкім акруговым зямельным аддзеле.

Міх.

Упарадкаваньне мястэчка Глуск

Бабруйск, 10-X. Гаспадарчае ўпарадкаваньне мястэчка Глуск заканчваецца. 271 гаспадарка местачковага насельніцтва надзелены зямлёю, утворана 2 пасёлкі, калгас, арганізавана жывёлаводнае таварыства, 2 машынныя таварыствы і некалькі саматужных арцеляў.

ШТО ІМ РЭВЗАКОННАСЬЦЬ!

У Дубровенскім раёне ў доме калгасу жывуць два кватэранты—Бахор і Геніч. Ад 1920 году жывуць яны ў гэтым доме, а арэнды нікаму ня плацяць. Калгас гэту справу перадаваў у суд некалькі разоў, але вынікі тыя-ж самыя: пакараныя грамадзяне сядзяць у доме, які сваёю безгаспадарчасьцю давялі да руіны. Хто тут вінават: ці раённыя валакітчыкі, ці цэнтральныя бюракраты, якія не зацьвярджаюць пастаноў раённых устаноў?

Л.

ДАРУЧАЮЦЬ АДЗІН ДРУГОМУ.

У мястэчку Капылі, Менскай акрузі пад самым носам РВК ёсьць вялікі роў, дзе часта людзі ломяць ногі. Але засыпаць яго ніхто ня думае. РВК даручыў гэту справу местачковаму савету, а апошні лічыць, што гэта справа РВК. Пакуль яны таргуюцца, людзі ломяць і далей.

Змаганьне за камуну.

НА ФРОНТ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ПЕРАБУДОВЫ.

Умірае старое—родзіцца новае. Канас ў перадсьмяротных сударгах усё старасьвецкае, струхнелае, збуцьвелае і заміняецца новым, баздёрым, радасным, квітнеючым,—так казалі сяляне Ляднянчыны, гледзячы на парк, на прысады, на разбураныя абшарніцкія будынкі і яшчэ пільней браліся за калектыўнае будаўніцтва.

Абшарнікі магутным выбухам рэвалюцыі даўно былі выкінуты, нібы коркі з бутэлек, з цёплых наседжаных месцаў. У 1923 і 1924 годзе быў надзвычайна гэрачны запал, энтузіязм у барацьбе за новую лепшую будучыню, гэта была вайна—рэвалюцыя за сваё вызваленьне ад жабрацтва, за новы сацыялістычны ўклад жыцьця.

Хто думаў у той час аб сацыялістычным жыцьці, ды яшчэ на Ляднянчыне. Людзі ламалі галовы над пытаньнем, як і на чым пажыцьця, спэкулянуць, узяць больш хабар, як скарыстаць больш чужой працы, пабудаваць моцны хутарок-адруб,—выступалі на сходах, даводзячы сваю сумленнасьць і адданасьць уладзе; запэўнялі, гарлапанілі аб сваёй вернай працы, дабіваліся „аўтарытэтаў", а пра тое ня думалі, як хутчэй скінуць кайданы спрадвечнага жабрацтва.

У той час, калі яшчэ гэтыя складаныя пытаньні жыцьця вырашаліся ў цэнтры, Ленін кінуў покліч да працоўнага сялянства:

— „Ня толькі на фронт грамадзянскай вайны, але на фронт культурнай, сацыялістычнай перабудовы вёскі накіруйце свае натугі і сілы".

На франтох грамадзянскай вайны грыміць кананада. Сотні, тысячы лепшых, адважных гаспадароў краіны кладуць свае галовы на палёх боек, і вось у гэты час гістарычных завірух змаганьня за саветы сяляне-перадавікі, сераднякі, беднякі пачалі гаварыць аб калгасах, і, урэшце, **групка людзей**—барацьбітоў за ажыцьцяўленьне сацыялізму ўзьнімае чырвоны сьцяг на Ляднянчыне:

— **У калектывы, камуны і арцелі!**

Гэта былі гады, калі аб камуне мала ведалі ў раёне, як яе афарыляць, як ёю кіраваць.

КУЛАЦТВА ШУМІЦЬ.

У чатырох былых абшарніцкіх маёнтках—Усьвяты, Самадумкі, Барайвінава і Капанік робіцца рэвалюцыя: на былых абшарніцкіх сядзібах растуць камуны і не адна і ня дзьве, а цэлы дзесятак. Каля 1000 гэктараў былой панскай зямлі адыходзе пад камуны—„Надзея Працы", „Увасходзячая Зьвязда" «Асьвета». „Трудавік", „1-я Барсьцьвінаўская", „2-я Барсьцьвінаўская", «Сінай», «Надзея», «Прагрэс» і «Ясны Дзень».

Шуміць разбэшчанае кулацтва, гледзячы, як беднякі пачынаюць арганізоўваюцца ў камуны і арцелі. На кожным сходзе беднату бэсьцяць—абзываюць лодырамі, абібокамі, галадранцамі.

— Камуні-і-і захацелі, галапупыя!

— Чужым-бы толькі карыстацца, а самі працаваць...

— Так, так... Ого, гэта свалочы!... Паноў прагналі, а цяпер...

Так цкавалі кулакі беднякоў. Цяжка было, вельмі цяжка спачатку, але група людзей гэрачна рабіла сваю справу, дасягала мэты.

Круты, стромкі, цярністы паварот жыцьця разгарнуўся ў шырокі сьветлы шлях і пры поўным нястрыманым разьбегу няроўнасьці і выбоіны былі напрыкметны. Камуны і арцелі нарадзіліся дробнымі і слабымі, але была мэта вырасьці, узбуйніцца, пашырыцца. Цяпер-жа самае галоўнае арганізавацца, падпісаць статуты, афарміцца.

Арганізаваўшыся, калектыўныя гаспадаркі жывуць год, другі, як раптам зусім нечакана пад агітацыю кулакоў некалькі чалавек камунараў з чыста кулацкімі намерамі захацелі па хутары. Справу гэту камунары давялі да ведама ўлады. Прыяжджае камісія ў складзе загадчыка дзяржаўнай запаснай зямельнай маёмасьці Сьняткоўскага і райагранома па яўрэйскаму землябудаўніцтву—Роэзэнблюма.

Роэзэнблюм сярод яўрэяў-камунараў вядзе агітацыю.

— Чаго вам ісьці ў камуну, вы-ж ніколі не працавалі на зямлі! Хутары б вам атрымаць, ды там кожнаму паасобку набіць руку, навучыцца. Усё роўна ў камуне нічога ня выйдзе. Антыкалгасныя погляды агранома надхапілі некаторыя, а большасьць высьмеялі яго, бо за некалькі год супольнага жыцьця яны ўбачылі на вопыце, на практыцы, што ў камунах жыць лепей.

ПРЫШЧЭПАЎ „ДАПАМАГАЕ".

Урэшце, камісія робіць вывады, што ў камуны пазалазіла частка людзей, каб захаваць цэнтральную зямлю для хутароў і адрубаў у будучыні, а зараз калектыўная гаспадарка не вядзецца, і гэтыя гаспадары ня хочуць калектыўна весьці яе. Акрэа хадайнічае перад акруговай зямельнай камісіяй, каб адабраць усе землі ў тых камунараў, якія захісталіся і хочуць хутароў, і перадаць землі камунам, а частку, дзе нельга залічыць за камунамі, перадаць у склад земляў дзяржаўнай маемасьці.

Усе тыя, што хацелі разарваць калектыўныя аб'яднаньні на хутары, былі незадоволены пастановай Аршанскай АЗК і абскардзілі гэту справу ў Асобную Калегію Вышэйшага Кантролю. Пасхалі хадакі да былога Наркома Прышчэпава, да Лабаноўскага. Знайшліся знаёмыя, і справа хутаран ня толькі стала „на мазі", але пачала нават пагражаць камунарам. Прыехаўшы з Менску, кулацкія хадакі распаўсюдзілі чуткі:

— Прышчапаў сказаў, што разгоне ўсе гэтыя камуны. Камунары, кажа, не маглі добра даглядзець свае бядняцкія гаспадаркі, а цяпер у калгасе чалавекам, гаспадаром будзе.

Камунары верылі і ня верылі, бо ня першы раз чулі розныя правакацыі ад клясава чужых людзей, праводзілі земляўпарадкаваньне, будавалі будынкі, праца ішла поўным ходам. А там, у Менску, наркомы за сваімі столікамі ціхіх габінэтаў, будучы ворагамі ўсяго новага калектыўнага, вырашаюць лёс будучых камунараў. У двух чалавек—Прышчэпава і Лабаноўскага—трэба прасіць міласьці, яны вырашаюць вялікія справы па зямельнай рэформе. Яны, толькі яны могуць дапамагчы. Але каму? Хто бачыў, што Прышчэпаў дапамог камунарам? Дзе гэта запісана ў гісторыі, хто чуў, каб Лабаноўскі апратэставаў заможніцка-кулацкую справу, адмовіў кулаку, былому абшарніку ў надзеле зямлёй? Разгортваюцца справы на працягу цэлых гадоў, а гэтага нідзе ня відаць І 27-га мая 1927 г. Асобная Калегія Вышэйшага Кантролю, папярэдня да мовіўшыся з Наркамземам, ухваліла пастанову:

„Рэарганізаваць калектыўныя аб'яднаньні і зямлю перадаць у прадоўнае карыстаньне паасобным гаспадаром».

Атрымалі пастанову. Заварушыліся кулакі і заможнікі, з вясёлымі, радаснымі тварамі пачалі зьдзекавацца, сьмяяцца з сумленных, адданых камунараў-беднякоў.

„Што, галадранцы, арганізавалі камунію? У камунію захацелі? Гэта вам не сямнаццаты год, калі вы што хацелі, тое і рабілі».

ХУТАРЫЗАЦЫЯ АРШАНШЧЫНЫ.

Партыйная райённая арганізацыя, а разам з гэтым і некаторыя і адказныя партыйныя работнікі з АК КП(б)Б не зьвярнулі ўвагі на „рэарганізацыю" калектыўных аб'яднаньняў. Яны сваім маўчаньнем далі згоду, санкцыянавалі разбурваць, нішчыць карысны, каштоўны фундамант сацыялістычнага будаўніцтва, якое распачыналі актывісты вёскі сераднякі, беднякі і батракі.

Камунары, а таксама беднята ня толькі Ляднянскага райёну, а цэлай Аршаншчыны ня чулі, каб склад бюро АК КП(б)Б 1927-28 год узьняў свой голас пратэсту супроць «рэарганізацыі", супроць разбурэньня 10 калгасаў. Адказныя акруговыя партыйныя працаўнікі, якія адказвалі за рост калектыўнага будаўніцтва, за рост сацыялістычнага сэктару проста па-таварыску падалі руку, далі згоду наркамземаўскім ворагам—правым ухілістам. Сёньня, калі разгледзець дэталёва гэта нытаньне, дык няма як моўчкі абыйсьці такі вялізарны прабел, палітычны ляпсус у нашым сацыялістычным будаўніцтве, як разбурэньне калгасаў. Ні ў якім разе ніякімі спосабамі партыйныя кіраўнікі ня могуць адмовіцца тым, што яны трымалі прымірэнчую лінію ў разбурэньні калгасаў, а яны самі павінны прызнаць, што ажыцьцяўлялі на практыцы правы ўхіл. Гэта так, бо ў пастановах як нідзе, ні слова ў абарону калгасаў.

Яшчэ адзін факт, які пацьвярджае яскравую праяву правага ўхілу з боку Наркамзему, а разам з гэтым поўнае падтрыманьне і садзейнічаньне мясцовымі зямельнымі і партыйнымі органамі — гэта хутарызацыя па Аршаншчыне. У дарэвалюцыйны час, у час сталыпінскай рэформы хутарызацыя закранула 10 проц. агульнай плошчы зямлі, а пасьля рэвалюцыі хутароў пабудавана на 5 проц. болей. Да рэвалюцыі была плошча пад хутарамі ў 86930 гэкт., а пасьля рэвалюцыі дасягнула — 128786 гэктараў. У Горацкім раёне, самым культурным, на тэрыторыі якога знаходзіцца Сельска-Гаспадарчая Акадэмія, у 1926-27 г. ня было ніводнага калгасу, а хутароў ня было куды падзець: яны займалі 78 проц. агульнай зямельнай плошчы.

Вось коратка аб тым недапушчальным ляпсусе ў калгасным будаўніцтве на Аршаншчыне, якое разбурвалі наркамземаўскія „кіты", а акруговыя „рэчы" падтрымлівалі і мала таго што падтрымлівалі, а і самі праводзілі такую-ж працу.

У

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ ЎРАДУ БССР

Пастанова

Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускай ССР АБ АСЛАБАНЕНЬНІ ТАВ. МАСАЛЬСКАГА, І. Я. АД АБАВЯЗКАЎ НАРОДНАГА КАМІСАРА САЦЫЯЛЬНАГА ЗАБЯСЬПЕЧАНЬНЯ БССР.

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР пастанаўляе:

Аслабаніць тав. Масальскага, Ігната Якубавіча ад абавязкаў Народнага Камісара Сацыяльнага Забяспечаньня БССР.

В. аб. Старшыні Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **А. Хацкевіч.**

За Сакратара Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **У. Ігнатоўскі.**

10-га кастрычніка 1929 г. г. Менск.

Пастанова

Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускай ССР АБ АСЛАБАНЕНЬНІ ТАВ. ГОХМАНА С. М. АД АБАВЯЗКА НАМЕСЬНІКА НАРОДНАГА КАМІСАРА ЮСТЫЦЫІ БССР.

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР пастанаўляе:

Аслабаніць тав. Гохмана, Станіслава Маркавіча ад абавязкаў Намесьніка Народнага Камісара Юстыцыі БССР.

В. аб. Старшыні Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **А. Хацкевіч.**

За Сакратара Цэтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **У. Ігнатоўскі.**

10-га кастрычніка 1929 г. г. Менск.

Пастанова

Эканамічнае Нарады пры СНК БССР

аб умовах прадажу запасных частак да трактараў і крэдытаваньня рамонту іх.

На падставе пастановы Савету Працы і Абароны за 6-га жніўня г. г. (прат. № 29-427) Эканамічная Нарады пастанаўляе:

1. Продаж запасных частак да трактараў вытварацъ, пачынаючы з 1 кастрычніка г. г., выключна за наяўны разрахунак.

2. У мэтах стымуляваньня своечасовай здачы трактараў у рамонт устанавіць наступныя ўмовы крэдытаваньня рамонту іх:

Пры агульнай каштоўнасьці рамонту	Пры больш раньняй здачы ў рамонт да пачатку сэзону (не пазьней 1 лютага)		Пры здачы ў рамонт пасьля 1 лютага	
	Наяўн.	Крэдыт.	Наяўн.	Крэдыт.
	За наяўны разрахунак.			
Да 100 руб.				
Ад 100 да 200 р.	35 проц.	65 проц.	50 проц.	50 проц.
„ 200 да 400 р.	25 „	75 „	40 „ але ня менш 80 р.	60 „
Звыш 400 р.	15 „	85 „	25 „	75 „

Старшыня Эканамічнае Нарады БССР **Карклін.**

Нам. Кіраўніка Спраў СНК і Эканамічнае Нарады БССР **В. Крывіцкі.**

10 кастрычніка 1929 г.

Постановление

Экономического Совещания при СНК БССР

об условиях продажи запасных частей к тракторам и кредитования ремонта их.

На основании постановления СТО за 6 августа с. г. (прот. № 29-427)—Экономическое Совещание постановляет:

1. Продажу запасных частей к тракторам производить, начиная с 1 октября с. г. исключительно за наличный расчет.

2. В целях стимулирования своевременной сдачи тракторов в ремонт—установить следующие условия кредитования ремонта их:

При общей стоимости ремонта	При более раньней сдачи в ремонт до начала сезона (не позднее 1 февраля)		При сдаче в ремонт после 1 февраля	
	Наличн.	Крэдит.	Наличн.	Кредит.
	За наличный расчет			
До 100 р.				
От 100 р. до 200 р.	35 проц.	65 проц.	50 проц.	50 проц.
От 200 до 400 р.	25 „	75 „	40 „ не менее 80 р.	60 „
Сверх 400 р.	15 „	85 „	25 „	75 „

Председатель Экономичного Совещания БССР **Карклин**

Зам. Управделами СНК и ЭКОСО БССР **В. Кривицкий.**

10 октября 1929 г.

Ажыцьцяўляем пяцігодку.

У МАЗЫРЫ БУДЗЕ ЎТВОРАН ПРАМЫСЛОВЫ РАЁН. БУДЗЕ ПАБУДАВАНЫ ДРЭВААПРАЦОВАЧНЫ КАМБІНАТ І ШЭРАГ ФАБРЫК. НАПРЭДАДНІ ЭЛЕКТРАФІКАЦЫІ МАЗЫРСКАГА РАЁНУ.

Паводле 5-гадовага пляну разьвіцьця прамысловасьці ВСНГ Бел. у Мазыры мяркуецца пабудаваць дрэваапрацовачны камбінат і запалкавую фабрыку. Плянам прадугледжана таксама разьсьці рэканструкцыю існуючых прадпрыёмстваў—фанэрнай фабрыкі Лесбелу і лесапільнага заводу.

Група энэргетыкі ВСНГ, маючы на ўвазе плян разьвіцьця прамысловасьці ў Мазыры, камандыравала туды інжынэра для распрацоўкі пляну забясьпечаньня г. Мазыру і ваколічных раёнаў электраэнэргіяй. Плян гэты ўвязаны з мяркуемай перадачай электраэнэргіі ў Мазыр з 2-й Беларускай раённай электрастанцыі.

Інжынэр т. Айзэнбэрг, які выяжджаў у Мазыр, у гутарцы з нашым супрацаўніком зазначыў што ў Мазыры мяркуецца ўтварыць спэцыяльны прамысловы раён, дзе будуць згрупаваны вызначаныя для пабудовы прадпрыёмствы—камбінат і запалкавая фабрыка, а таксама і шэраг прадпрыёмстваў, пабудова якіх прадугледжана ў працягу другой пяцігодкі

Для забясьпечаньня дрэваапрацовачнага камбінату электраэнэргіяй і парам для тэхналёгічных мэт прадугледжана пабудаваць у Мазыры „Теплоэлектроцентраль", якая да пуску 2-й раённай электрастанцы будзе забясьпечваць Мазыр са ўсімі прадпрыёмствамі і бліжэйшыя раёны,—у прыватнасьці г. Калінкавічы. У радыусе 10 кілёмэтраў ад Мазыра будзе давацца электраэнэргія для ваколічных калгасаў і вёсак.

На тэрыторыі мяркуемага новага прамысловага раёну ў Мазыры маецца на ўвазе пабудаваць галоўную паніжаную падстанцыю 2-й Беларускай раённай электрастанцыі, адкуль электраэнэргія будзе разьмяркоўвацца па ўсяму раёну.

Кіраўніцтва Заходніх чыгунак меркавала пабудаваць электрастанцыю ў Калінкавічах, але ў зьвязку з будучай электрафікацыяй гэтага гораду, ВСНГ ставіць пытаньне перад Галоўэлектра аб уключэньні чыгуначнай станцыі ў агульную сетку.

Апрача таго, ВСНГБ узьнімае пытаньне аб пабудове на левым беразе р. Прыпяці ў г. Мазыры шклянога заводу, які ў поўнай меры будзе забясьпечан мясцовай сыравінай. Пытаньне гэта ўжо прапрацоўвае Мазырская інспэкцыя мясцовай прамысловасьці.

У Мазыршчыне ёсьць шмат чароту. Зараз праводзяцца вопыты дзеля скарыстаньня яго на папяровых фабрыках для вырабу паперы. Калі вопыты будуць праведзены з посьпехам, дык паўстане пытаньне аб пабудове ў Мазырскім раёне папяровай фабрыкі.

Гэтымі днямі у Мазыр выехала спэцыяльная камісія з прадстаўнікоў ВСНГ, Лесбелу і „Древстроя" для канчатковага выбару месца пад пабудову дрэваапрацовачнага камбінату. Ужо атрыман дазвол на ліцэнзію для ўвозу з-заграніцы турбагенэратара магутнасьцю ў 1500 кілёват. Пасьля таго, як будзе абрана месца для пабудовы камбінату, неадкладна разгорнуцца падрыхтоўчыя работы па будаўніцтву яго і «Теплоэлектроцентраля».

ХРОНІКА.

Разьвіцьцё падсочнай прамысловасьці.

5 КАНІФОЛЬНА-ШПІГІНАРНЫХ ЗАВОДАЎ

Палічча ў Беларусі 1.500 тысяч гэктараў сасновых дрэвастанаў дае вялікія пэрспэктывы для разьвіцьця падсочнай прамысловасьці.

Па пяцігадоваму пляну прадугледжваецца скарыстаньне сасновай лесасекі в агульнай плошчаю ў 25 тысяч гэктараў. У бліжэйшыя гады ў Беларусі будуць пабудаваны 5 каніфольна-шпігінарных заводаў; у працу па падсочцы будзе ўцягнута каля 16 тысяч рабочых.

Лесзаг НКЗБ прарабіў вялікую працу па пашырэньні падсочнай прамысловасьці. Праца вядзецца на 3.500 гэктараў замест 2.000, прадугледжаных па пляну.

У Барысаве пабудаваны ўжо каніфольна-шпігінарны завод, які пушчан у ход.

Прэзыдыум саюзу с.-г. і лясных рабочых пастананавіў правесьці па ўсіх акругах пашыраныя вытворчыя нарады з удзелам старшынь рабкомаў для абгаварэньня пытаньня аб пашырэньні падсочкі.

З 15-га лістапада адчыняюцца 2-х месячныя курсы для падрыхтоўкі майстроў па падсочцы. На курсы будзе прыняты 40 чалавек, пераважна аб'ездчыкаў.

Дзеля вывучэньня пастаноўкі працы па падсочцы і мэтадаў яе перапрацоўкі НКЗем мае камандыраваць за межы адпаведных спэцыялістаў.

Клімавіцкі раён будзе цалкам калектывізаваны.

Гэтымі днямі скончыўся аб'яднаны пленум Магілеўскага АК і АКК КП(б)Б.

Пленум выкес надта важнае рашэньне аб узмацненьні і далейшым пашырэньні калектывізацыі сельскае гаспадаркі на Клімаўшчыне.

Клімавіцкі раён, калектывізаваны пакуль-што на 18 проц. налічвае ў сабе найбуйнейшыя калгасы акругі—(„Камунар Магілеўшчыны" і інш.) на плошчы да 4000 гэктараў.

Гэты раён вызначан пленумам як такі, дзе цалкам будзе праводзіцца калектывізацыя. Увага ўсіх савецкіх і грамадзкіх арганізацый Магілеву прыкавана дажыцьця гэтага раёну--асяродку ранейшай Клімаўшчыны.

Курсы для падрыхтоўкі рабочых у ВНУ і рабфакі.

Культадзел ЦСПСБ распрацоўвае сетку курсаў для падрыхтоўкі рабочых і работніц у вышэйшыя навучальныя ўстановы, рабфакі і тэхнікумы.

Курсы мяркуецца адчыніць у Менску, Гомелі, Віцебску і Барысаве. У якасьці выкладчыкаў на курсах будзе прыцягнута студэнцтва ў парадку грамадзкай працы.

Тэхнічныя курсы.

Згодна пастановы саюзу с.-г. і лясных рабочых з 12 кастрычніка ў Менску адчыняюцца курсы па падрыхтоўцы рабочых для маторных пілак і трактарыстаў.

Курсы разьлічаны на 20 чалавек.

Каапэраваньне батрацтва.

Прэзыдыум саюзу с.-г. і лясных рабочых распрацаваў шэраг мерапрыёмстваў па каапэраваньню батрацтва. Перад Белсельсаюзам узьнята пытаньне, каб за кошт каапэраваньня бедноты і батрацтва было ўцягнута ў кааперныя т-вы 10 тысяч батракоў і ў саўгасна-гародныя т-вы —2 тысячы батракоў, а па лініі малочнай каапэрацыі—8 тысяч чал., галоўным чынам пастухоў.

Падрыхтоўка вылучэнцаў.

У бліжэйшым часе праўленьне менскага ЦРК адчыняе курсы для падрыхтоўкі вылучэнцаў на пасаду загадчыкаў магазынаў. На курсах будзе навучацца 50 чалавек, пераважна рабочых ад варштату з менскіх прадпрыемстваў.

Новыя кнігі.

Паступілі ў рэдакцыю газэты „Савецкая Беларусь" для рэцэнзіі наступныя кнігі і часопісі:

1. **С. Тупяневіч. „Грыбныя хваробы расьлін".** Стар. 66, цана 20 кап.

2. **М. Маркевіч. Чаму мы перамаглі ў грамадзянскай вайне.** Пераклад з расейскай мовы. Стар. 22, цана 10 к.

3. **Праф. В. Доліно-Іваненкі. „Як будаваць трубчатыя студні".** Сялянская бібліятэка № 126. Стар. 77, цана 30 к. Выданьне Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва.

4. **„Каапэрацыя БССР" № 11.** Двухтыднёвы орган каапэрацыйных цэнтраў БССР, Белсельбанку і Усекабанку. Стар. 31, цана 25 кап.

СПРАВАЧНЫ АДДЗЕЛ.

КАТЫРОЎКА ПАЗЫК НА 11-е КАСТРЫЧНІКА 1929 г.

	Куп.	Прад.
1 6 проц. выйгр. паз.	4.95	—
Бяспроц. выйгр. паз. 26 г.	127.25	129.25
Выйгр. пазыка 1929 г.	100.15	100.55
10 проц. выйгр. паз. 27 г.	25.44	25.54
3-я сялянск. выйгр. паз. 27 г.	5.	—
Дзярж. паз. узм. сял. гас.	10.41	10.76
1 выйг. паз. індустр. 27 г.	25.16	25.26
2 „ „ „ проц.	25.30	25.40
2 „ „ „ б-проц.	25.30	25.40
11 проц. дзярж. паз. 28 г.	101.19	101.24
12 проц. рэнтная паз. 27 г.	104.27	—

За лепшае абслугоўваньне спажыўца.

За апошні гаспадарчы год Менскі ЦРК адчыніў 83 новыя крамы, з іх 56—па акраінах гораду.

На сёньнешні дзень 42 крамы МЦРК пераведзены на бесперапынны тыдзень. Пасьля падрыхтоўкі новых кадраў на курсах, што зараз працуюць, будзе пераведзена яшчэ шэраг крам ЦРК на бесперапынны тыдзень. Наогул, да 1 сьнежня Менскі ЦРК пераведзе на бесперапынны рабочы тыдзень 66 крам.

Да адказнасьці за самавольнае нарміраваньне.

Праўленьне Менскай каапэрацыі інвалідаў па сваёй ініцыятыве ўвяло нарміраваньне ў продаж каўбасных вырабаў.

Менскі акруговы інспэктарыят гандлю адмяніў гэта незаконнае распараджэньне і перадаў справу ў пракуратуру для прыцягненьня вінаватых у самавольным увядзеньні нарміраваньня да судовай адказнасьці.

Культурная чайная.

У адзнаку 12-й гадавіны Кастрычніка-вай рэвалюцыі на Віленскім рынку адчыняецца культурная чайная.

Чайная мае на мэце ўзмацніць барацьбу з алкагалізмам, яна будзе абслугоўваць рабочых і прыежджых сялян.

Ячэйкі чырвонага крыжу ў сацыялістычнае спаборніцтва.

Менскае акруговае т-ва чырвонага крыжу выклікала на сацыялістычнае спаборніцтва Гомельскае т-ва. Дагавор прадугледжвае арганізацыю новых ячэек і палепшэньне працы.

На бесперапынны тыдзень.

Апарат праўленьня Менскага Цэрабкопу з 15 кастрычніка пераводзіць сваю працу на бесперапынны рабочы тыдзень.

Пачалася чыстка прафсаюзнага апарату.

НАРАДА РАБОЧЫХ БРЫГАД.

Пачалася чыстка апарату ЦП саюзаў і ЦСПСБ.

На нарадзе рабочых брыгад, якая адбылася гэтымі днямі, абгаварвалася пытаньне аб працы брыгад у сувязі з чысткай.

— Брыгады павінны, галоўным чынам, праверыць работу тых працаўнікоў, якія зьвязаны з рабочай масай завастрыўшы ўвагу на тым, як яны здольны выконваць свае абавязкі і наколькі яны зразумелі новыя мэтады работы.

Для выяўленьня хібаў працы прафсаюзнага апарату ў хуткім часе склікаецца нарада прафактыву г. Менску па пытаньню аб чыстцы.

У дапамогу брыгадам будуць прыцягнуты атрады „лёгкай кавалерыі".

У бліжэйшым часе пачнецца чыстка прафсаюзнага апарату ў акругах і раёнах.

Увесь матар'ял аб працы брыгад павінен прадстаўлящца ў камісію на праверцы прафсаюзнага апарату.

Чыстка апарату ЦП і ЦСПСБ будзе скончана да 1 лістападу.

ФІЗКУЛЬТУРА І СПОРТ.

Узмацніць ФК працу сярод дзяцей.

Прэзыдыум ВСФКБеларусі намеціў шэраг мерапрыемстваў да ўзмацненьня фізкультурнай працы сярод дзяцей. Пры ЦБ ЮныхПіанэраў выдзяляецца інструктар для кіраўніцтва дзіцячым фізрухам. У акруговых арганізоўваюцца сэмінары па фізкультуры для кіраўнікоў атрадаў, пры ўсіх піанэр-атрадах будуць утвораны гімнастычна-спартыўныя гуткі.

Футбольная сустрэча Менск-Смаленск.

У нядзелю, 13 кастрычніка, на летнім спортыўнай пляцоўцы „Прафінтэрн" адбудзецца сустрэча на футболу паміж камандамі „Дынамо" Менск і Смаленску.

Да прыёму ў ФК тэхнікум.

Менскі Акрсавет фізкультуры вызначыў 13 кандыдатур у тэхнікум фізкультуры.

Усяго ў тэхнікумы будзе прынята 45 чалавек. Прыём будзе скончан да 15-га кастрычніка.

Заняткі ў тэхнікуме пачнуцца з 1-га лістападу.

Паштовая скрынка.

А. ШПАКУ. Бабр. акр. Допіс „Рагачэўскія распраддзяліцелі" друкаваць ня будзем—дробязь.

Т-В. Шуміліка. Допіс „Будущие строители социализма" пераслалі ў Наркамасьветы.

П. ПЕРАПЕЧКУ. Ваш ліст „К сведению"... пераслалі ў Наркамасьветы.

ЗНАЁМАМУ. Бярэзіна. Ваш допіс „А бюракрат і цяцер там" пераслалі ў Менскі акр. інспэктарыят нар. асьветы.

Шчыльней сувязь між Белдзяржкіно і пісьменьнікамі.

9-га кастрычніка ў Доме Пісьменьнікаў адбылася сустрэча Белдзяржкіно з беларускімі пісьменьнікамі. Нягледзячы на тое, што абмеркаваньне тэматычнага пляну Белдзяржкіно зьяўляецца вельмі важнай справай, нажаль на гэты сход зьявіліся ня ўсе пісьменьнікі г. Менску.

У сваім уступным слове намесьнік дырэктара Белдзяржкіно т. Александровіч спыніўся на задачах як кіно, так і літаратуры ў сучасны момант.

— Гэтыя віды мастацтва,—кажа прамоўца,—мусяць складаць адзіную брыгаду, якая павінна ставіць сваёй задачай папулярызацыю 5-ці гадовага пляну нашага сацыялістычнага будаўніцтва. Вось чаму і Белдзяржкіно і наша літаратура павінны абраць адзіны шлях працы.

Як павінна ўтварацца сувязь паміж Белдзяржкіно і беларускімі пісьменьнікамі? Гэта сувязь павінна вылівіцца ў стварэньні сцэнарыяў.

Белдзяржкіно зацікаўлена ў тым, каб з кадраў беларускіх пісьменьнікаў стварыць добрых сцэнарыстаў. Дзеля гэтага Белдзяржкіно камандыруе на курсы сцэнарыстаў у Маскву і Ленінград 5 чалавек.

Гаворачы аб недахопах у карцінах, якія часам сустракаюцца, т. Александровіч лічыць, што трэба арганізаваць чытку сцэнарыяў на сходах пісьменьнікаў. Гэта дасьць магчымасьць своечасова унікнуць розных ляпсусаў.

Прадстаўнік Белдзяржкіно т. Дзяржавін пазнаёміў сход з тэматычным плянам на наступны год.

У спрэчках выступіла шэраг рышоў.

Тав. **Ліманоўскі** лічыць, што дзяржкіно павінна ўжыць захо таго, каб падрыхтаваць пісьм да пісаньня сцэнарыяў. Бяз нельга дабіцца пэўных посьпехаў

— На маю думку,—кажа т. **ковіч**,—у тэматычным пляне Бел кіно няма стрыжанёвай усі Стрыжанём павінен быць наш довы плян. Кіно павінна ў шую чаргу дапамагаць папуляр 5-дігодкі.

— Сярод твораў нашых пісь каў,—зазначае далей прамоўца,— шмат твораў, якія можна сцэна гэта творы Лынькова, Шашалев інш. Наша кіно павінна зьв больш увагі на калектывізацыю Гэтаму пытаньню трэба адвесьці месца ў тэматычным пляне БДК

Тав. **Бядуля** лічыць, што ва ло стварыць некалькі фільмаў д цячага кіно. Далей т. Бядуля вы думку, што Белдзяржкіно павінна чула падыходзіць да пісьменьнік ка не прападзе дарма, калі нава нары і ня будзе прыняты.

Тав. тав. **Гольдбэрг, Бар Ліхадзіеўскі** зазначылі, што зьвярнуць увагу на стварэньне рускага культурнага фільму. Т трэба стварыць фільмы, якія лі-б наша культурнае будаўніцт ла сцэнарыяў з рабочага жыцьц жыцьця нашае моладзі, з піанэр руху.

Апавяшчэньні.

ДА ЎСІХ НАВУКОВЫХ ПРАЦАЎНІКОЎ г. МЕНСКУ.

У суботу, 12 кастрычніка, а 6 з паловаю гадз. увечары ў зале Камвузу склікаецца агульны сход навуковых працаўнікоў гор. Менску і членаў Пленуму Цэнтральнага Савету Сэкцыі Навуковых Працаўнікоў.

Павестка дня:

1. Сацыяльістычнае будаўніцтва і навуковыя працаўнікі.
2. Клясавая барацьба на навуковым фронце,—дакл. тав. Панкевіч.
3. Пэрспэктывы новага акадэмічнага году—дакл. т. Платун.
4. Сацыяльістычнае спаборніцтва—тав. Вальфсон.
5. План працы ЦБ СНП—т. Казан.

З прычыны важнасьці пытаньняў, якія стаяць на павестку дня, яўка ўсіх навуковых працаўнікоў гор. Менску на сход у парадку прафсаюзнай дысцыпліны—абавязкова.

ЦБ СНП БССР.

— У пятніцу 11 кастрычніка г. г. а 8 гадз. увечары ў аўдыторыі нэрвовай клінікі мэдфаку адбудуцца перавыбраньня Ун-ту. На гэты сход шаюцца ўсе навуковыя працаўнікі сытэту.

СХОД МЕНСКАЙ ФІЛІІ БЕЛАП.

— Сёньня а 8 з паловай гадзіны чары ў Доме Пісьменьніка (Савецка адбудзецца чарговы сход філіі.

На парадку дня:

1. Арганізацыйныя пытаньні (справа ча бюро і перавыбары).
2. Распрацоўка пляну на 1929-30
3. Прыём новых членаў.

З прычыны важнасьці пытаньняў сутнасьць усіх членаў філіі абавязк

БЮРО ФІЛІІ БелАП

ДОМ АСЬВЕТЫ.

Паведамленьне праўленьня дому а дзіне ў нядзелю 13 кастрычніка.

Дзіцячы сад будзе працаваць з кастрычніка.

Адказны рэдактар П. ШАСТАКІ.

ЗАКЛЮЧНЫ БАЛЯНС КАМУНАЛЬНА-АБСЛУГОЎВАЮЧАГА ТРЭСТУ

На 1-га кастрычніка 1928 году.

АКТЫЎ			ПАСЫЎ	
I. Пасыўасьць.			I. Капіталы:	
1. Будынкі і пабудовы	1302794—26		1. Статутны	1422924—26
2. Абсталяваньне і машыны	96106—80		2. Амартызацыйны	29683—78
3. Інструманты	1242—24		3. Рэзэрвовы	9078 — 1461686 04
4. Гаспадарчы інвэнтар	69494—02		II. Фонды:	
5. Транспарт	15009—99	1484647—31	Фонд палепшаньня быту рабочых	2585 58
II. Запасное абсталяваньне		5252—41	III. Рэзэрвы:	
III. Няскончаныя пабудовы		108423—30	Рэзэрв няпэўных даўгоў	5607 37
IV. Няскончаны грунт. рамонт		7485—32	IV. Бюджэтнае фінансаваньне:	
V. Матар'ялы:			Мясцовы бюджэт пазыкі	50000 —
1. Апал.	3761—84		V. Доўгатэрміновыя крэдыты:	
2. Дапаможныя матар'ялы	3699—29		Пазыкі з прамфонду	35000 —
3. Рамонтна-будаўнічыя матар'ялы	10529—88		VI. Вэксалі выдадзеныя	43558 95
4. Матар'ялы і апал у дарозе	44—48	18035—49	VII. Крэдыторы:	
VI. Няскончаная вытворчасьць		3590—51	1. Рабочыя і служачыя	2013—56
VII. Грашовыя сродкі:			2. Дастаўшчыкі і падрадчыкі	17252—03
1. Каса	2966—30		3. Пакупцы і заказчыкі	4938—04
2. Бягучыя рахункі	1861—39	4827—69	4. Крэдыторы розныя	5993—94 30197 57
VIII. Каштоўныя і %% паперы:			VIII. Выгіні:	
1. Дзяржаўная гарант. пазыка	4560—		Прыбытак справаздачн. году	54799 68
2. Іншыя паперы	210—	4770 —		
IX. Падоправаздачныя сумы		312—39		
X. Дэбіторы:				
1. Рабочыя і служачыя	3380—08			
2. Дастаўшчыкі і падрадчыкі	2490—23			
3. Пакупцы і заказчыкі	20236—30			
4. Дэбіторы розныя	9595—83			
5. Няпэўныя даўжнікі	5607—87	41310—31		
XI. Выдаткі будучых гадоў:				
1. Выдаткі будучага году	3781—06			
2. Выдаткі па разьліку	1000—	4781—06		
БАЛЯНС		1683435—79	БАЛЯНС	1683435 79

РАХУНАК

прыбыткаў і страт па Камунальна-абслугоўваючаму трэсту за 1927-1928 гаспадарчы год

НАЗВА СТАЦЕЙ	Прыватная	Агульная	НАЗВА СТАЦЕЙ	Прыватная	Агульная
1. Агульна-адміністрацыйныя выдаткі		16679—72	1. Прыбытак ад эксплёатацыі		62974 54
2. %% уплачаныя кароткатэрмін. крэд.		2533—26	2. Прыбытак ад рэалізацыі маемасьці		1033 17
3. Страта ад недахопу матар'ялаў		16—36	3. %%% атрыманыя:		
4. Адлічэньні ў рэзэрв няпэўных даўгоў		1600—18	а) ад %%% папер	129—77	
5. Штрафы, пені і няўстойкі аплач		306—06	б) па бягучых рахунках	187—64	
6. Страта ад ацэнкі матар'ялаў		61—17	в) па разьліках і вэксалёх	106—28	423 69
7. Выпадковыя выдаткі:			4. Лішкі матар'ялаў		331 38
а) за дармовыя білеты ў лазьню	40 —		5. Прыбыт. ад пералічан. нескарыст. рэзэрву няпэўн. даўгоў		227 67
б) за амартызац. інвэнт. у розн. асоб	131—17		6. Пені і няўстойкі атрыманыя		269 03
в) сьпісаньне з разлік рах. для ўрэг.	17—50		7. Выпадковыя прыбыткі		115 —
г) страта ад разборкі студні на ст. МБВ	175—85		8. Прыбыткі мінулага году		12798 —
д) аплата водпуск. часовым працаўн.	46—89	411—41			
8. Выдаткі мінулых гадоў:		1820—97			
Усяго выдаткаў		23429—13			
Чысты прыбытак		54799—68			
БАЛЯНС		78228—81	БАЛЯНС		78228 81

ЗАБАЛЯНСАВЫЯ АРТЫКУЛЫ:

1. Вэксалятрымальнікі па забясьпечаньню	65000 —	1. Гарантыйныя вэксалі выдадзеныя	65000 —
2. Маемасьць на хаваньні	900 —	2. Установы па маемасьці на хаваньні	900 —
Разам за балянсам	65900 —	Разам за балянсам	65900 —

Разьмеркаваньне

Прыбытковы падатак	10 проц. з Р. 54799—68	Руб.	5480 —
На патрэбы прафтэхнічн. асьветы	3 проц. „ Р. 49319—68	„	1479—59
Фубр	10 проц. „ Р. 47840—09	„	4784 —
Мясцовы бюджэт	30 проц.	„	14352 —
Акруговы фонд	25 проц.	„	11960 —
Рэспублік. „	10 проц.	„	4784 —
Рэзэрвовы капітал	10 проц.	„	4784 —
У зваротныя сродкі	15 проц.	„	7176—09
			Руб. 54799—68

Дырэктар АБКАМТРЭСТУ АГОЛ. **Галоўны бухгальтар РАБЧЫК.**

Заключны балянс, рахунак страт і прыбыткаў і разьмеркавачьне прыбытку зацьверджаны сталай камісіяй пры Менакрфа ў пасяджэньні ад 10 чэрвеня г. г. і прэзыдыумам Менакрвыканкому ў пасяджэньні ад 11-12 чэрвеня (пратакол № 9) і да друку дазволен.

Інспэктар непад. прыбытк. Менакрфа КОРБУТ.

ТЭАТР-КІНО

КІНО-ТЭАТР „КУЛЬТУРА".	3 панядзелка 7 кастрычніка **„Гандляры славай".** Кіно-хроніка Белдзяржкіно «БАБРУЙСКІЯ МАНЭЎРЫ».
КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ».	3 панядзелка 7 кастрычніка французкі сэнсацыйны фільм **„Апошні палёт".** Звыш праграмы: хроніка СОВКІНО № 44. Пачатак а 7 гадзіне
КІНО ПРАЛЕТАРЫ	2 фільмы ў адзін сэанс. **I. Сэрца Азіі. II. Унучак бабкі.** Пачатака а 7 гадз. Каса а 6 гадз.
1-Ы ДЗІЦЯЧЫ КІНО-ТЭАТР „ЮНЫ ПІАНЭР".	3 панядзелка 7 кастрычніка цікавы фільм савецкай вытворчасьці **„Гогі Рацыані"** у 6 частках. Звыш праграмы: кіно-хроніка СОВКІНО. Каса а 2 гадз. Кошт білету 10 кап.

Блонскі с.-савет, Пухавіцкага р-ну, Менакругі выклікае грамадз. Дашкевіча Гвідана Іванава на 20 кастрычніка 1929 г. па оправо аб скасаваньні шлюбу з гр-кай Дашкевіч Надзеждай Вацлаваўнай.

ЗГУБЛЕНЫ.

— Вучотна-конская кніжка № 1498 Пятрушаня І. К., выд. Старадароск. райваенкаматам, кв. 660п.

— Паявая кніжка № 34 Жукаўца П. К., выд. Старадароск. спаж. т-вам, кв. 660п.

— Паявая кніжка № 1165 Шчэглік М. А., выд. Старадароск. спаж. т-вам, кв. 660п.

— Паявая кніжка № 2146 Емельянавай П. І., выд. Старадароск. спаж. т-вам, кв. 660п.

— Паявая кніжка № 1526 Жукаўца О. А., выд. Старадароск. спаж. т-вам, кв. 660п.

— Пасьведчаньне аб пягодпасьці к вайсковай службе Русаковіча М., выд. Бабруйск. акруг. прызыўн. каміс., кв. 660п.

— Паявая кніжка № 1007 Шпіляна І. В., выд. Старадароск. спаж. т-вам, кв. 660п.

— Квіткі за № 10746 на суму 1 р. 51 к. № 10745 на суму 7 р., № 10739 на суму 6 р. 12 к., № 10736 на суму 8 р. 51 к. Непачаловіча Р., выд. нач. 6 вуч. аддз. загатовак Зах. чыг. Асыпавіцкага райёну,

— Вучотна-конская кніжка № 1951 Талапа У. Д., выд. Старадароск. райваенкамат, кв. 660п.

Га дойлітбел 595

Друкарня БДВ.